Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

САКАВІК 28 СЕРАДА 1934 г. № 68 (4901) Год выдання XVII

*Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!*

## АБ ПЛАНАХ СЯЎБЫ ДЛЯ АДНААСОБНІКАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ У СОЎГАСАХ

### *Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР*

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

Устанавіць, што ў адносінах аднаасобнікаў, якія пераходзяць у 1934 г. на пастаянную работу ў соўгасы па працоўных дагаварах паміж соўгасам і аднаасобнікам на перыяд работы не менш сельскагаспадарчага сезона, — не ўстанаўляецца планаў сяўбы ў 1934 г., і гэтыя аднаасобныя гаспадаркі вызваляюцца ад абавязковых паставак дзяржаве зярна, сланечніку, бульбы і рысу.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.
Кіраўнік справамі Совета Народных Камісараў Саюза ССР І. МІРОШНІКАЎ.

## Адказ таварыша СТАЛІНА піонерам і школьнікам сяла Новая Уда

ІРКУТСК, 25 сакавіка. (Па тэлеграфу ад кар. «Правды»).

У «Восточносибирской правде» 24 сакавіка надрукован адказ таварыша Сталіна на пісьмо да яго піонераў і школьнікаў сяла Новая Уда («Правда», 6 студзеня):

«ПІОНЕРАМ І ШКОЛЬНІКАМ ШКОЛЫ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ СЯЛА НОВАЯ УДА (УСХОДНЯЯ СІБІРСКАГА КРАЯ).

ТАВАРЫШАМ ШАТХАНАВУ, БАТУРАВАЙ, ГЕРГЕНАВАЙ, ДАНІЛАВУ, ДАРАЖЭЕВУ.

ПРАШУ ПРАБАЧЭННЯ ЗА ПОЗНІ АДКАЗ. ВЕЛЬМІ ТРОНУТ ВАШЫМ ПРЫВІТАННЕМ. ЖАДАЮ ВАМ ЗДАРОЎЯ І ПОСПЕХАЎ У ВУЧЭННІ Ў ГРАМАДСКАЙ РАБОЦЕ. СПАДЗЯЮСЯ, ШТО ПАСПЯХОВА ЗАКОНЧЫЦЕ ВУЧОБУ І СТАНЕЦЕ ЭНЕРГІЧНЫМІ, ВЕДАЮЧЫМІ РАБОТ ЛЮДЗМІ, ЯКІЯ НЕАБХОДНЫ ДЛЯ НАШАЙ КРАІНЫ.

Я, МОЛАТАЎ, ВАРАШЫЛАЎ І КАГАНОВІЧ ПАСЫЛАЕМ ВАМ НЕВЯЛІЧКІ ПАДАРУНАК: РАДЫЁАПАРАТ І ПАТЭФОН З ПЛАСЦІНКАМІ. ДУМАЮ, ШТО ЦЯПЕР ВАША РАДЫЁКРОПКА БУДЗЕ ПРЫВЕДЗЕНА Ў ПАРАДАК.

ПРЫВІТАННЕ ВАМ АД МОЛАТАВА, ВАРАШЫЛАВА І КАГАНОВІЧА. ЖАДАЮ ВАМ УСЯГО ДОБРАГА.

І. СТАЛІН.

## НЕАДКЛАДНА УРУЧЫЦЬ КОЖНАМУ ПАСЕЎШЧЫКУ ЦВЁРДЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПА ПАСТАЎЦЫ ЗБОЖЖА І БУЛЬБЫ

### У Полацкім, Лёзненскім і Аршанскім раёнах працягваецца ігнараванне аднаасобнікаў

*28 САКАВІКА*

Своечасовае давядзенне цвёрдых абавязацельстваў па пастаўцы сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве да кожнага калгаса, калгасніка і працоўнага аднаасобніка мае выключнае значэнне для паспяховага правядзення веснавой пасеўнай кампаніі.

Пры своечасовым атрыманні абавязацельства кожны калгас, калгаснік і працоўны аднаасобнік будуць зацікаўлены ў поўным і добраякасным выкананні ўстаноўленага плана сяўбы, бо размер цвёрдага абавязацельства будзе ім загадзя вядомы.

Не гледзячы на важнасць гэтага мерапрыемства, па БССР абавязацельствы ўручаны толькі 26 проц. пасеўшчыкаў.

Асноўная маса няўручаных абавязацельстваў падае на аднаасобны сектар. Тут асабліва дае сябе адчуваць «лявацкая» практыка недаацэнкі аднаасобніка. Зусім невыпадкова, што ў такіх раёнах як Магілеўскі, Расонскі, дзе ігнараванне аднаасобнікаў працягваецца, абавязацельствы ўручаны толькі 4-8 проц. аднаасобных гаспадарак, а такія раёны, як Бабруйскі, Жлобінскі, Лельчыцкі, Рагачоўскі і Чэрыкаўскі, дзе процант аднаасобнікаў яшчэ высокі, да ўручэння абавязацельстваў нават не прыступілі.

Адсутнасць масавай растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў, «лявацкія» разважанні аб тым, што «калі-б не давялі план, а аднаасобніка ўсё роўна прымусім выканаць», не атрымліваюць належнага адпору з боку партыйных арганізацый гэтых раёнаў.

Да пачатку масавай сяўбы засталіся лічаныя дні. Кожны калгас, калгаснік і аднаасобнік павінны цвёрда ведаць планы абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадук таў дзяржаве. Далейшая зацяжка з давядзеннем абавязацельстваў, асабліва да аднаасобнікаў зрывае паспяховую падрыхтоўку да сяўбы па гэтаму сектару.

Райкомы партыі павінны неадкладна ў бліжэйшыя дні забяспечыць уручэнне абавязацельстваў аднаасобнікам. Усялякая зацяжка з давядзеннем абавязацельстваў павінна разглядацца, як простае ігнараванне аднаасобніка, як дапамога класава-варожым элементам у іх імкненнях сарваць планы веснавой пасеўнай кампаніі.

Кожнаму пасеўшчыку неадкладна ўручыць цвёрдыя абавязацельствы па пастаўцы сельска-гаспадарчай прадукцыі.

*СЯЎБА У АЗОВА-ЧОРНАМОРСКІМ КРАІ*

ФОТА ШЭЎЧЭНКА (САЮЗФОТА).

Соўгас імя тав. Сталіна пачаў ворыва. Якасць ворыва добрая. Глыбіня баразны 20 сантыметраў.

## Аб фактах убою жывёлы, указаных у „Правде" ад 18 сакавіка 1934 г. у заметцы „Скот уничтожают на глазах райкома"

### *Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б*

1. Адзначыць, што факты драпежніцкага ўбою жывёлы ў Дубровенскім раёне, указаныя ў заметцы ў «Правде» за 18 сакавіка г. г., пад загалоўкам «Скот уничтожают на глазах райкома»—цалкам І поўнасцю пацвердзіліся.

2. Масавы ўбой і разбазарванне жывёлы, меўшыя месца ў Дубровенскім раёне, з'явіліся рэзультатам адсутнасці арганізацыйнай і палітмасавай работы ў галіне жывёлагадоўлі, асабліва сярод аднаасобнікаў. Карыстаючыся гэтай акалічнасцю, кулацкія спекулятыўныя элементы разгарнулі шырокую агітацыю і работу па ўбою жывёлы, падрываючы гэтым самым жывёлагадоўлю і калгаснае будаўніцтва.

Партыйнае і совецкае кіраўніцтва Дубровенскага раёна не толькі не прыняла мер да расследвання і пікідацыі фактаў драпежніцкага знішчэння жывёлы, але і стала на шлях замазвання і апартуністычнага выкрывання выяўленых фактаў.

3. Выкліканыя на пасяджэнне ЦК разам з Дубровенскім райкомам старшыня Горацкага РВК тав. ЛАБАНАЎ і сакратар Мсціслаўскага райкома тав. ТАРАСАЎ у сваіх тлумачэннях паказалі, што кіраўніцтва гэтых раёнаў таксама не ўсвядоміла аграмаднага палітычнага і гаспадарчага значэння пастаўленых партыяй задач у галіне жывёлагадоўлі, што факты ўбою і разбазарвання жывёлы, меўшыя месца ў асобных вёсках Горацкага і Мсціслаўскага раёнаў, не гледзячы на прынятыя гэтымі раёнамі меры, не выклікалі яшчэ неабходнай трывогі і мабілізацыі ўсёй партарганізацыі, асабліва ў Горацкім раёне, на рашучы адпор спробам кулака зрываць намечаныя партыяй мерапрыемствы па развіццю жывёлагадоўлі.

4. ЦК лічыць, што ўскрытыя за апошні час у радзе раёнаў БССР факты драпежніцкага ўбою жывёлы сведчаць аб адсутнасці перабудовы метадаў кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, у асаблівасці жывёлагадоўляй, з боку раённых, партыйных і совецкіх арганізацый і зямельных органаў, у тым ліку і Наркамзема, а таксама аб няўменні гэтых арганізацый распазнаваць і ўскрываць новыя метады барацьбы кулацкіх і антысовецкіх элементаў супроць сацыялістычнага будаўніцтва. Раённыя, партыйныя і совецкія арганізацыі яшчэ не забяспечылі неабходных канкрэтных арганізацыйных, гаспадарчых і палітычных мерапрыемстваў, мабілізуючых шырокія масы калгаснікаў і аднаасобнікаў на рэалізацыю рашэнняў XVII з'езда партыі аб развіцці жывёлагадоўлі.

Бюро ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Сакратара Дубровенскага РК КП(б)Б т. КАЦМАНА, які не забяспечыў большэвіцкага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, асабліва справай жывёлагадоўлі ў сваім раёне, з работы зняць і паслаць на нізавую работу. У адносінах намесніка сакратара Дубровенскага РК КП(б)Б тав. ВАШКЕВІЧА, улічваючы тую акалічнасць, што ён толькі нядаўна працуе ў раёне,—абмежавацца аб'яўленнем вымовы. Старшыню Дубровенскага РВК т. СЕМАШКА за фармальныя адносіны да сваіх абавязкаў, якія выявіліся ў тым, што т. СЕМАШКА не толькі не прыняў неадкладных мер па фактах масавага ўбою жывёлы, калі яны яму сталі вядомы, але адмовіўся нават выступіць на бюро РК з паведамленнем аб прымаемых райвыканкомам мерах па гэтаму пытанню,—з работы зняць і аддаць суду.

Прапанаваць пракурору рэспублікі т. КУЗЬМІНУ на працягу 5 дзён расследваць і поўнасцю выявіць кан крэтных вінаўнікаў у драпежніцкім убоі і разбазарванні жывёлы па Дубровенскаму раёну і прыцягнуць іх да судовай адказнасці.

2. У мэтах аказання Дубровенскай партыйнай арганізацыі практычнай дапамогі для прынятня неадкладных мер па спыненню масавага ўбою жывёлы і прыняцця на месцы мер па разгортванню сапраўднай масавай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў у Дубровенскім раёне —камандываць начальніка жывёлагадоўчага кіраўніцтва Наркамзема т. СТРЭЛЕ, пракурора рэспублікі т. КУЗЬМІНА і адк. інструктара с.-г. аддзела ЦК т. ВАЙНШТЭЙНА.

3. Прапанаваць усім гаркомам і райкомам КП(б)Б шырока прапрацаваць у партыйных арганізацыях і у масах калгаснікаў і аднаасобнікаў урокі Касцюковіцкага і Дубровенскага раёнаў, забяспечыўшы, на аснове выкарыстання вопыту Менскага ГК КП(б)Б (гл. газ. «Рабочий» ад 22-III-34 г. і «Калг. Беларусі» ад 23-III-34 г.) рад канкрэтных арганізацыйных, гаспадарчых і палітычных мерапрыемстваў па рэалізацыі рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) аб уздыме і развіцці жывёлагадоўлі.

## Аб акалічнасцях, звязаных з правядзеннем агразоатэхнічнай канферэнцыі ў Полацку

### *Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 27 сакавіка 1934 г.*

1. Адзначыць прайўленую ініцыятыву і вялікую работу, праробленую Полацкай МТС і полацкай раённай газетай «Чырвоная Полаччына» (у асобе нам. начальніка палітаддзела тав. СТРОНГІНА і нам. рэдактара газеты тав. ЗЕЛЬМАНАВА) у падрыхтоўцы і правядзенні агразоатэхнічнай канферэнцыі, даўшай вялізарныя разультаты ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, і барацьбе за высокі ўраджай у Полацкім раёне.

2. Адначасова адзначыць, што партыйнае і совецкае кіраўніцтва Полацкага раёна, не зразумеўшы значэння агразоатэхнічнай канферэнцыі, не ўключылася дастаткова актыўна ў справу падрыхтоўкі і правядзення гэтай канферэнцыі.

3. Адзначаючы, як станоўчы факт, непасрэдны ўдзел Акадэміі Навук у правядзенні агразоатэхнічнай канферэнцыі ў Полацку (асабліва маючы на ўвазе навукова-папулярныя выступленні прафесараў Дарожкіна, Домбаля, Мяцельскага), ЦК у той-жа час падкрэслівае, што Акадэмія не праявіла дастатковай арганізаванасці ў абслугоўванні гэтай канферэнцыі.

4. ЦК таксама адзначае, што Наркамзем не забяспечыў абслугоўвання агразоатэхнічнай канферэнцыі кваліфікаванымі работнікамі і не скарыстаў ле ў мэтах разгортвання паўсюднага масавага руху калгаснікаў і аднаасобнікаў за большэвіцкую падрыхтоўку сяўбы і высокую ўраджайнасць.

5. ЦК канстатуе, што газета «Звязда» ўключылася ў справу падрыхтоўкі і правядзення канферэнцыі, аднак, у сваім артыкуле аб выніках канферэнцыі («Звязда» ад 11 сакавіка) рэдакцыя «Звязды» дапусціла памылку, узмоцнена завастрыўшы недахопы, меўшыя месца пры правядзенні канферэнцыі з боку работнікаў Акадэміі Навук, тым самым перанесла цэнтр цяжару на нязначныя недахопы паасобных работнікаў і, па сутнасці, аспабіла грамадска-палітычнае і гаспадарчае значэнне канферэнцыі.

6. ЦК даручае тав. ГОРЫНУ прыцягнуць да адказнасці тых з работнікаў Акадэміі, якія дапусцілі няправільную інфармацыю БЕЛТА аб рабоце БелАН па абслугоўванню канферэнцыі, у прыватнасці аб паездцы на канферэнцыю т. т. Горына, Стрэле і інш.

7. ЦК прапануе тав. БРАГІНСКАМУ ў сваю чаргу змясціць у «Звязде» 2-3 артыкулы, у якіх шырока папулярызаваць станоўчы вопыт полацкай агразоатэхнічнай канферэнцыі і яе вялікае арганізуючае значэнне ў падрыхтоўцы да правядзення с.-г. года; у гэтых-жа артыкулах указаць на няправільнасць тону, які быў дан брыгадай «Звязды» ў артыкуле ад 11 сакавіка ў частцы, якая датычыць крытыкі работнікаў БелАН.

8. Прапанаваць рэдактару газеты «Рабочий» тав. ХЕЙФЕЦУ выправіць памылку ў карэспандэнцыі, змешчанай у газеце «Рабочий» ад 8 сакавіка, скажаючай сапраўдны сэнс выступлення тав. Домбаля на канферэнцыі.

9. ЦК лічыць неабходным у далейшым правесці рад таго-ж роду канферэнцый: 2-3 канферэнцыі пры палітаддзелах і адну раённую. Арганізацыю гэтай справы даручыць Наркамзему, Акадэміі Навук і рэдакцыі «Звязды», пад кіраўніцтвам сельгасаддзела ЦК і палітсектара Наркамзема.

## Абавязацельствы не ўручаны

СТАРОБІН. У раёне зрываецца давядзенне абавязацельстваў па пастаўцы зярна і бульбы да пасеў шчыкаў. Тлумачыцца гэта тым, што дагэтуль па калгаснаму сектару яшчэ дасканала не вызначаны планы сяўбы. МТС не заключыла дагавароў з калгасамі на правядзенне работ. Не складзены спісы пасеўшчыкаў і па аднаасобнаму сектару, бо да аднаасобнікаў таксама яшчэ не даведзены планы сяўбы.

Райупаўкамзаг.

## Злёт перадавых аднаасобнікаў

СІРОЦІНА. Адбыўся злёт перадавых аднаасобнікаў Жэрабіцкага сельсовета. Аднаасобнікі гэтага сельсовета не дрэнна падрыхтаваліся да сяўбы. Засыпана і ачышчана насенне, адрамантован інвентар, копі сярэдняй сытасці, гной вывезен на поле, праводзіцца збор попелу. Лепшыя аднаасобнікі: Шаячка Дзімітра, Галубёў Васіль і інш. дапамаглі падрыхтавацца да сяўбы адстаючым.

Злёт падрабязна абмеркаваў пастанову ЦК КП(б)Б аб становішчы жывёлагадоўлі па Касцюковіцкаму раёну і асудзіў выпадкі забою жывёлы ў сваім сельсовеце з боку паасобных аднаасобнікаў. Злёт ухваліў рашэнне прэзідыума сельсовета аб адданні суду аднаасобнікаў Бзегодава Ларыёна і Улопенка Міхася, якія драпежніцкі эксплаатавалі коняй і вывелі іх са строю.

Злёт абавязаўся вывесці коняй на палявыя работы вышэй сярэдняй упітанасці, арганізаваць добры догляд жаробных матак, захаваць і выгадаваць увесь прыплод, своечасова правесці злучную кампанію.

Увесь партыйна-совецкі актыў раёна мабілізован на правядзенне злётаў перадавых аднаасобнікаў у астатніх сельсоветах. (БЕЛТА).

## АБ АДНААСОБНІКУ ЗАБЫЛІСЯ

### (*Ад полацкага карэспандэнта „Звязды"*)

За апошнія два месяцы шмат пастаноў і цыркуляраў было паслана ў сельсоветы полацкімі раённымі арганізацыямі. Але ні ў адной з пастаноў няма ні слова аб аднаасобніках, як быццам у раёне іх няма. У сапраўднасці аднаасобнікі павінны засеяць гэтай вясной 25.864 га або 35 проц. усяго яравога кліну.

Не дзіўна, што да гэтага часу аднаасобнікі не падрыхтаваны да сяўбы. У асобных сельсоветах адна асобнікі да гэтага часу не ведаюць, дзе яны будуць сеяць. У **Нацкім** сельсавеце нядаўна быў арганізаван калгас. Частка зямлі аднаасобнікаў адыйшла ў калгас, а застаўшымся аднаасобнікам да гэтага часу не адведзена зямля. Такі-ж малюнак у **Ветрынскім, Сяструўскім** сельсоветах.

Старшыня Ветрынскага сельсовета тав. Дароўка замест таго, каб дапамагчы аднаасобнікам, выступае на пленуме сельсовета з такой устаноўкай: «Сяўбу правядзем з людзьмі або без людзей, але правядзем». Гэты яўна «лявацкі» загіб не атрымаў адпору з боку партыйнай арганізацыі сельсовета. «Устаноўкі» Дароўкі прывялі да таго, што ў Ветрынскім сельсавеце аднаасобнікамі на 20 сакавіка не ачышчана ні адно кіло насення.

Кіраўнікі Полацкай і Ветрынскай МТС лічаць, што ім непатрэбна займацца аднаасобнікамі. Дырэктар Полацкай МТС Рэйнікаў не палічыў патрэбным нават даць указанні сваім калгасам аб дапамозе аднаасобнікам у ачыстцы насення. Як вынік, з 33 сельсоветаў толькі 4 пачалі ачыстку насення. Да вывазкі-ж гною ні ў адным сельсавеце аднаасобнікі не прыступілі.

Недаацэнка аднаасобнікаў прывяла да таго, што ў радзе сельсоветаў раёна застаўшыхся аднаасобнікаў лічаць жулікамі і сабатажнікамі. Старшыня Замшанскага сельсовета тав. **Мятлюк** на пытанне, як у вас справа з аднаасобнікамі адказвае: «у мяне засталося некалькі жулікаў і сабатажнікаў, непатрэбна імі займацца, яны самі засеюць». Добрае некалькі... У сельсавеце больш 80 аднаасобных гаспадарак і ні адна гаспадарка не вядзе ніякай падрыхтоўкі да сяўбы.

Адсутнасць масавай работы сярод аднаасобнікаў выхарыстоўвае кулак, які вядзе агітацыю за разбазарванне насення і коняй. Кожную нядзелю можна ўбачыць на базары, як аднаасобнікі прадаюць коняй.

Да пачатку сяўбы засталося зусім мала. Трэба зараз-жа выправіць дапушчаныя намылкі ў адносінах аднаасобнага сектара, з тым, каб аднаасобнік уступіў у сяўбу поўнасцю падрыхтаваным.

Н. НЕЙДЛІН.

## Утрыманчыя тэндэнцыі лёзненскага райза

ЛЕЗНА. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Больш двух тысяч аднаасобных гаспадарак павінны засеяць 7503 га яравых, у тым ліку 1.500 га ільну.

Ці ёсць гарантыя ў тым, што гэта плошча будзе сапраўды поўнасцю засеяна?

Не, няма. Лёзненскія раённыя арганізацыі зусім не ведаюць, як рыхтуюцца да сяўбы аднаасобнікі.

Для засеву ільну аднаасобнаму сектару патрэбна 1.800 цэнт. ільнасемя, а ёсць толькі 540 цэнт. Гэта ўсё, што вядома райземаддзелу, яго загадчыку тав. **Шарыкаву** і намесніку тав. **Кавалеўскаму.**

Сур'ёзнай дзелавой праверкай сапраўднага забеспячэння насеннем аднаасобнікаў ніхто да гэтага часу не займаецца.

Калі нават ёсць 540 цэнтн. ільнасемя, то дзе-ж узяць астатнія 1.260 цэнтн.?

— А хто яго ведае, — бесклапотна адказвае т. Шарыкаў. —Можа дзяржава пазыку адпусціць або дазволіць разбаніраваць страхавы фонд. Бліжэй к вясне відаць будзе.

Гэта яўна ўтрыманчыя настроі.

Пра якасць насення ільну ні тав. Шарыкаў, ні Кавалеўскі не ведаюць. У райза ніхто не мог адказаць на пытанне — як абстаіць справа з насеннем іншых зернавых і бульбы. Нічога не ведаюць таксама работнікі райза аб становішчы сельска-гаспадарчага інвентара і конскай цягавай сілы ў аднаасобным сектары.

«Звязда» пісала ўжо аб планавай «чахардзе» ў Лёзненшчыне. Але яна прадаўжаецца і цяпер.

Унаўскаму сельсавету па аднаасобнаму сектару быў даведзен план яравых у размеры 686 га. Старшыня сельсовета Клімчанка, сам дакладна не ведаючы аб сапраўднай колькасці аднаасобных гаспадарак у сельсавеце, хадайнічаў у РВК аб змяншэнні плана. Просьба Клімчанкі задаволена. З 686 га план зменшан да 515 га. Астатнія 171 га размеркаваны механічна па іншых сельсоветах.

Старшыня сельсовета тав. Шапураў засыпае райза дакладнымі запіскамі, пратэстуючы супроць дадатковага плана.

У радзе сельсоветаў многім аднаасобным гаспадаркам яшчэ да гэтага часу зямля не адведзена. У Замшанскім сельсавеце такіх гаспадарак каля 30, у Унаўскім — каля 40.

Такое-ж становішча ў большасці сельсоветаў Лёзненскага раёна. Пра аднаасобніка ў Лёзне забылі, аб яго гатоўнасці да сяўбы мала хто думае.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

## Аб мерапрыемствах па развіццю канаплеводчай гаспадаркі

### Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

Для стварэння большай зацікаўленасці калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў у развіцці канаплеводчай гаспадаркі і павышэння ўраджайнасці канапель Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б у адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 11 сакавіка г. г. («Известия ЦИК СССР» ад 12 сак.) пастанаўляюць:

1. Аслабаніць ад абавязковай паставкі бульбы дзяржаве і ад здачы дзяржаве гародніны па абавязковай кантрактацыі калгасы, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, якія будуць сеяць канопліі на сядзібных, прысядзібных і пойменных участках і выканаюць свае абавязацельствы ў адпаведнасці з кантрактацыйнымі дагаворамі аб здачы дзяржаве пянькі на тую колькасць гектараў, якая была занята пад канопліі на сядзібных, прысядзібных і пойменных участках.

Гэту ільготу прымяняць пачынаючы з бягучага года.

2. Падвоіць норму продажы хлеба калгасам, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам па цвёрдых дзяржаўных цэнах і ўстанавіць пачынаючы з 15 сакавіка г. г. продажу хлеба за кожны зданы цэнтнер пянькі-валакна ў наступным размеры: для калгасаў 3 цэнтнеры, для калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў—2,5 цэнтнера.

3. Павысіць нормы продажы па цвёрдых дзяржаўных цэнах алею і жмыху здатчыкам семя за кожны зданы дзяржаве цэнтнер у наступным размеры: для калгасаў—6 кгр. алею і 12 жмыхоў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў—5 кгр. алею і 10 кгр. жмыхоў.

4. Абавязаць НК Земляробства ў 3-хдзенны тэрмін даць дырэктыву на месцы, каб для калгаснікаў, якія займаюцца мочкай, сушкай і мялцем канапель, залічаліся 2 працадні за выкананне дзённай нормы па працоўкі, устаноўленай існуючымі расцэнкамі.

5. Абавязаць Уп. Кам. Заг. СНК СССР па БССР у адпаведнасці з гэтай пастановай на працягу 3-х дзён выдаць інструкцыю.

6. Абавязаць РВК і РК КП(б)Б і сельсоветы шырока папулярызаваць гэтыя ільготы ў мясцовым друку і прапрацаваць на агульных сходах калгаснікаў і аднаасобнікаў.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД. Сакратар ЦК КП(б)Б Н. ГІКАЛО.

## 5 красавіка—адзіны комсамольскі дзень

### *Начальнікам палітаддзелаў МТС, іх памочнікам па комсамолу*

Прапаную правесці 5 красавіка 1934 года адзіны саюзны дзень комсамольскіх ячэек калгасаў сумесна з па-за саюзнай моладдзю па прапрацоўцы пісьма сакратара ЦК ВЛКСМ тав. КОСАРЭВА («Комсомольская Правда» 23-III, «Ч. З.» 25-III—34 г.) ячэйцы калгаса «ПЕРАДАВІК», Кубаніска-Азерскага раёна, Паўночнага края.

На гэтым саюзным дні неабходна на аснове разгорнутай самакрытыкі з усёй рэзкасцю ўскрыць наяўныя недахопы ў рабоце ячэйкі ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі і намеціць мерапрыемствы, каб ячэйка сапраўды выканала ўказанні тав. Косарэва — «Дабіцца, каб усё лепшае, што ёсць у калгасе, было зроблена рукамі комсамольцаў і моладзі:

а) лепшыя сявяркі комсамольскія;
б) лепшыя канюшні ў вёсцы комсамольскія;
в) лепшыя трактары комсамольскія».

Чарговы нумар палітаддзельскай газеты прысвяціць падрыхтоўцы моладзі да веснавой сяўбы.

У правядзенні комсамольскага дня ў ячэйках прыняць удзел усім работнікам палітаддзела. Пасылаемых палітаддзелам для правядзення саюзнага дня і падрыхтоўкі яго работнікаў інструктаваць асабіста нач. палітаддзела.

У парадку падрыхтоўчай работы да саюзнага дня неабходна:

Арганізаваць атрады лёгкай кавалерыі ў ячэйках, уважліва падбіраючы кіраўнікоў атрадаў, з намячэннем праграмы работы атрадаў на ўвесь перыяд па падрыхтоўцы і правядзенню сяўбы.

На саюзным дні шырока абмеркаваць выпрацаваны план работы ячэйкі (арганізацыйнай, культурна-масавай) на сяўбе.

Паведамляйце цэнтральны друк, у першую чаргу «Чырвоную змену» аб ходзе падрыхтоўкі і правядзенні саюзнага дня.

Саюзны дзень правесці без дакладаў, зачытаць пісьмо тав. Косарэва, заслухаць кароткія зусім канкрэтныя выступленні перадавых брыгад моладзі па пытаннях сяўбы і абмеркаваць практычныя мерапрыемствы.

Нач. палітсектара МТС НКЗ БССР РАТНЕК.
Пам. нач. палітсектара МТС па комсамолу ЭЦІН.

## Статыстык здзіўляецца

(Ад аршанскага карэспандэнта «Звязды»).

Аднаасобнік вёскі Малыя Салаўі (Аршаншчына) **Ганчарэнка Васіль** раўнаецца па калгасах. Ён адрамантаваў свой плуг у суседнім калгасе «Шлях совецкаў», набыў новую барану, падрыхтаваў як след каня, засыпаў насенне на ўвесь кравы клін, праверыў яго на ўсхожасць.

Ён прытлядаецца да перадавых калгасаў, збіраецца туды. Але пакуль усё адкладае. Ганчарэнка сёлета рашыў сеяць яшчэ на сваёй палосны, але пасеяць па-ўдарнаму.

Аднак работа Ганчарэнкі не характарызуе агульнага стану падрыхтоўкі да сяўбы аднаасобнага сектара па раёну.

У Панізаўскім сельсавеце 285 аднаасобных гаспадарак. Яны павінны засеяць больш 1.000 га. Але большасць аднаасобнікаў зусім не рыхтуецца да сяўбы. У большасці не хапае насення, не хапае 50 коняй. Гэта па ўсяму сельсавету. А ў в. Стаўры справа абстаіць яшчэ горш.

З 42 аднаасобнікаў толькі 26 маюць коняй. З іх 10 для работы не прыгодны. 20 гаспадарак не мае насення. І коні, і насенне, і цяляты—усё разбазарваецца.

А як і чым будзеце сеяць?

— Засеем, — адказваюць стаўраўскія аднаасобнікі.

— І план выканаеце?

— Які план? Нам ніхто ніякага плану не даводзіў...

Член сельсовета **Пусцельнікаў** толькі рукамі разводзіць:

— Проста не ведаю, што рабіць...

Як-жа адносіцца да гэтага райземаддзел? У сельсавеце не хапае насення, а райза забраў ад Панізаўскага камітэта ўзаемазапамогі 11,5 тон насення і... перавёў у другія сельсоветы.

Панізаўскі сельсавет—не адзіны. Аднаасобнікі Крапівенскага, Якаўлевіцкага і іншых сельсоветаў таксама зрываюць падрыхтоўку да сяўбы.

Статыстык райземаддзела, падагульваючы весткі з сельсоветаў, здзіўляецца:

— Што за ліха! У графе «вывазка гною аднаасобнікамі» амаль ніводнай лічбы.

А здзіўляцца няма чаго. Кіраўнікі Аршанскага райземаддзела лічаць ніжэй свайго гонару займацца такімі «дробязямі», як аднаасобнік і пусцілі справу на самацёк.

В. Даль.

## Напярэдадні пасеўнай

### (*Па матэрыялах БелТА і нашых карэспандэнтаў*)

На ініцыятыве палітаддзела Пухавіцкай МТС праведзена канферэнцыя калгасных сейбітаў, у якой прымала ўдзел 200 чалавек.

Удзельнікі канферэнцыі абавязаліся сеяць насеннем не ніжэй 90 проц. усхожасці, поўнасцю скарыстаць угнаенне, попел і торф. Ban ферэнцыя адобрыла ініцыятыву палітаддзела аб арганізацыі 15-дзённых курсаў калгасных сейбітаў.

Трактарны парк Ветрынскай МТС дагэтуль не гатоў к выхаду у поле. З 40 трактароў адрамантавана толькі 10. З 23 сявярак адраманавана 16, астатніх яшчэ няма ў майстэрнях. Работнікі МТС нават не ведаюць, у якіх калгасах яны знаходзяцца. Ніхто не пляпопіцца аб набыцці інвентара для запраўкі трактароў.

Да і красавіка павінна быць закончана складанне вытворча-фінансавых планаў. У Рагачоўскім раёне з 151 калгаса ні адзін не склаў плана. Бланкі, атрыманыя райземаддзелам 12 сакавіка, дагэтуль не разасланы калгасам. Намеснік загадчыка райземаддзела Зянькоў лічыць, што цяпер за гэта варта ўжо брацца.

## У ЦК ВКП(б)

# АБ ПАСТАНОЎЦЫ ПРАПАГАНДЫ РАШЭННЯЎ XVII З'ЕЗДА У ІВАНАЎСКАЙ І У ЦЭНТРАЛЬНА-ЧОРНАЗЕМНАЙ АБЛАСЦЯХ

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) заслухаў даклады абкомаў Іванаўскай і Цэнтральна-Чорназемнай вобласці, Іванаўскага гаркома і суддаклад культпропа ЦК аб пастаноўцы прапаганды рашэнняў XVII з'езда. Работа культпропаў абкомаў Цэнтральна-Чорназемнай вобласці і Іванаўскага па прапагандзе рашэнняў XVII з'езда прызнана нездавальняючай.

ЦК лічыць, што абкомы Цэнтральна-Чорназемнай вобласці і Іванаўскі не забяспечылі кіраўніцтва гэтай важнейшай работай, у прыватнасці не забяспечылі партыйцаў брашурамі даклада тав. Сталіна і іншымі матэрыяламі з'езда.

Абкомам Цэнтральна-Чорназемнай вобласці і Іванаўскаму прапанавана ў пяцідзённы тэрмін абмеркаваць гэта пытанне на спецыяльных пасяджэннях бюро абкомаў і аб прынятых мерах паведаміць ЦК.

## БРАКАРОБЫ

**4 САКАВІКА.** Сёння газета «Звязда» надрукавала тэзісы для дакладчыкаў — **«Пятнаццаць год Комуністычнага Інтэрнацыянала».**

**5 САКАВІКА.** Дакладчыкі, паста янныя чытачы добра ведаюць некаторыя слабасці «Звязды». Яны прывыклі к апячаткам «па недагляду карэктуры», «па віне выпускаючага», к шаласцям неахайных перакладчыкаў, к бяспечнасці рэдакцыі. Таму чытач і звычайна на другі дзень пасля паяўлення адказных перакладаў старанна шукаюць на чацвертай старонцы папраўкі. Сёння ў свайму найвялікшаму здзіўленню чытачы не знайшлі ніякіх паправак.

**6 САКАВІКА.** «Звязда» зноў не надрукавала ні адной папраўкі. Відаць усё ў парадку. Найбольш даверлівыя дакладчыкі і чытачы рашылі, што на гэты раз газета надрукавала важны палітычны дакумент без памылак, без браку.

Адзін толькі ўпарты чытач, студэнт Комуністычнага інстытута журналістыкі тав. **Калдобскі** не паверыў. Пачакаўшы некалькі дзён, ён першяліва пачаў вывучаць, звяраць рускі тэкст з беларускім перакладам.

**10 САКАВІКА.** «Інспектар якасці» тав. Калдобскі выявіў першую памылку. У тэзісах сказана:

> «Германская социял-дэмакратыя... натраўлівала германскіх рабочых НА Окцябрскую рэволюцыю».

А «Звязда» надрукавала:

> «Германская социял-дэмакратыя... натраўлівала германскіх рабочых ЗА Окцябрскую рэволюцыю».

Так маленькае перамяшчэнне літар выклікае вельмі буйныя палітычныя скажэнні.

**11 САКАВІКА.** Даследчык перакладу ўстанавіў яшчэ адно чудовішчнае скажэнне. У IV раздзеле тэзісаў гаворыцца:

> «У 1914 годзе перад тварам не параўнальна больш моцнага і сільнага капіталізма міжнародны пролетарыят, ЗДРАДЖАНЫ ПРАВАДЫРАМІ II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА, меў толькі адну большэвіцкую партыю — партыю Леніна».

Перакладчыкі бесцэрамонна ўносяць свае папраўкі ў летапісь рэволюцыйнага руху. У перакладзе «Звязды» гэты тэзіс атрымлівае зусім іншы сэнс.

> «У 1914 годзе перад тварам не параўнальна больш моцнага і сільнага капіталізма міжнародны пролетарыят, АДДАНЫ ПРАВАДЫРАМ II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА, меў толькі адну большэвіцкую партыю — партыю Леніна».

Агідная алсябяціна. Чудовішчная бессэнсіца. «Міжнародны пролетарыят, аддаены правадырам II Інтэрнацыянала, меў толькі адну большэвіцкую партыю (?!).

Што гэта? Толькі неахайнасць, нядбайнасць, выпадковая памылка ці нешта большае?

**13 САКАВІКА.** Тав. Калдобскі скончыў работу. Ён знайшоў у перакладзе яшчэ некалькі памылак і недакладнасцей і напісаў аб гэтым у «Правду».

* * *

Няўжо ў «Звязде» не заўважылі гэтых скажэнняў? Або, быць можа, газета рашыла прамаўчаць, пашчадзіць бракаробаў, не гаварыць аб палітычным браку на ўласных старонках?

Але многія-ж дакладчыкі, чытачы і раённыя газеты будуць карыстацца тэзісамі толькі ў перакладзе «Звязды». Не стане-ж кожны з іх звяраць беларускі пераклад з рускім тэкстам.

Відаць, усё-ж «Звязде» прыдзецца надрукаваць папраўкі. З некаторым спазненнем, праўда. Але, як гэта гаворыцца, лепш позна, чым ніколі («Правда»).

**АД РЭДАКЦЫІ:**

**Рэдакцыя лічыць зусім правільнымі ўказанні «Правды» на грубыя памылкі, дапушчаныя пры перакладзе такога адказнага матэрыяла, як тэзісы да 15-годдзя Комінтэрна. Наша памылка паглыбляецца тым, што неахайнасць перакладу не была намі заўважана і выпраўлена.**

**На вінаватых у неахайнасці пераклада рэдакцыяй накладзены спагнанні.**

## Выпраўленне памылкі

У пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб планаванні перавозак і паляпшэнні работы мясцовых органаў НКШЗ» у пункце 8 прапушчаны словы «штосутачны план». Гэты пункт трэба чытаць так:

8. Зацвердзіць наступны прадстаўлены НКШЗ **ШТОСУТАЧНЫ** план размеркавання вагонаў па грузах I і II катэгорый на красавік 1934 года на дарогах СССР

| НАЗВЫ ДАРОГ | Штодзённы план штосутачнай пагрузкі на красавік | З іх Грузы I кат. | Грузы 2 кат. | Разгрузка НКШЗ |
|---|---|---|---|---|
| Маскоўска-Казанская | 2.700 | 2.265 | 385 | 50 |
| Моск.-Курская | 2.700 | 2.502 | 168 | 30 |
| Моск.-Акружная | 400 | 359 | 11 | 30 |
| Маскоўна-Ночная | 3.000 | 2.675 | 295 | 30 |
| Паўн.-Уральская | 1.100 | 995 | 90 | 15 |
| Сібірская | 3.300 | 2.700 | 560 | 40 |
| Паўдзённа-Сібірская | 1.500 | 1.313 | 172 | 15 |
| Паўночна-Д.Д.Б. | 1.700 | 1.464 | 206 | 30 |
| Паўднёвая | 2.100 | 1.738 | 322 | 40 |
| Паўд.-Усходняя | 2.70 | 2.418 | 252 | 30 |
| Паўн.-Каўказская | 3.700 | 3.500 | 160 | 40 |
| Закацерынінская | 6.500 | 6.230 | 255 | 15 |
| Данецкая | 8.200 | 7.905 | 270 | 25 |
| Паўднёвая | 1.200 | 1.098 | 75 | 27 |
| Паўднёва-Заходняя | 2.700 | 2.369 | 301 | 30 |
| Закаўказская | 1.800 | 1.665 | 120 | 15 |
| Гярэдня-Азіяцкая | 1.300 | 1.195 | 75 | 30 |
| Турксіб | 250 | 200 | 40 | 10 |
| Сам.-Златаустаўск | 1.000 | 835 | 150 | 15 |
| Пермская | 3.850 | 3.494 | 341 | 15 |
| Омская | 1.200 | 1.080 | 105 | 15 |
| Томская | 2.975 | 2.850 | 110 | 15 |
| Кузбаская | 25 | 15 | 7 | 3 |
| Забайкальская | 850 | 780 | 60 | 10 |
| Усурыйская | 1.250 | 1.135 | 110 | 5 |
| УСЯГО ПА СЕТЦЫ: | 58.000 | 52.780 | 4.640 | 580 |

(«Правда»).

# УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ „ЗОТАЎЦАЎ" АДБУДЗЕЦЦА ТАМ, ДЗЕ БУДУЦЬ ЛЕПШЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ТЭХВУЧОБЫ

## АБ ЧЫМ РАСКАЗВАЛІ НА РАДЫЁЗЛЁЦЕ ПЕРАДАВІКІ АЎЛАДАННЯ ТЭХНІКАЙ

**Нядаўна «Звязда» Радыёкамітэт БССР і ЦСПСБ арганізавалі радыёзлёт знаўкістаў ЗОТ. На радыёвузлах буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР (Менск, Віцебск, Гомель, Магілеў, Орша, Барысаў і інш) было арганізавана калектыўнае слуханне.**

**Злёт паказаў, што цэлы рад прадпрыемстваў маюць вялікія дасягненні ў арганізацыі тэхнічнай вучобы, здачы соцтэхэкзамена. На такіх фабрыках, як шаўковая імя КУЙБЫШЭВА (Магілеў), панчошна-трыкатажная імя КЛАРЫ ЦЭТКІН (Віцебск), можна і патрэбна чэрпаць вопыт арганізацыі тэхнічнай вучобы.**

**Адначасова злёт выявіў цэлы рад недахопаў у здачы соцтэхэкзамена, а на асобных прадпрыемствах і поўны провал яго. Вось ад гомельскай швэйнай фабрыкі «КОМІНТЭРН» выступала ўдарніца зотаўка тав. АЎРЫЦЕНКА З 1.200 чалавек на ўсёй фабрыцы здалі соцтэхэкзамен усяго 10 чалавек, з якіх толькі адна (тав. Аўрыценка) здала на значок ЗОТ. Мы запыталі ў сакратара комсамольскага калектыва фабрыкі т. КАЦ, чаму так ганебна правальваецца здача соцтэхэкзамена. Адказныя словы тав. Каца панеслися па эфіру: «было значна горш». Мусіць на фабрыцы «Комінтэрн» і гэта лічаць вялікім дасягненнем, бо справа абставіла яшчэ горш.**

**Злёт паказаў, што не ўсе яшчэ прадпрыемствы разгарнулі работу па падрыхтоўцы да ўсебеларускага злёта значкістаў ЗОТ лёгкай прамысловасці, які адбудзецца ў сярэдзіне красавіка.**

**Задача заключаецца зараз у тым, каб узмацніць кіраўніцтва па арганізацыі тэхвучобы і здачы соцтэхэкзамена і прыйсці на злёт з лепшымі паказальнікамі.**

*Зарэцкі Іван,*

КАЛГАСНІК АРЦЕЛІ «ПЕРАДАВІК», БАРЫСАЎСКАГА РАЁНА.

### НЕ АДСТАНЕМ АД ПРОЛЕТАРЫЯЎ ГОРАДА

Прачытаўшы матэрыялы 1-га ўсесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў, а пасля пабыўшы на раённым злёце калгаснікаў-ударнікаў, я паставіў перад сабой задачу рыхтаваць агразоатэхніку.

У сакавіку мінулага года я арганізаваў аграгурток і сам кіраваў ім. Да гэтай справы прыложыў шмат энергіі. Я паставіў работу так, што ўсё тое, што прапрацоўвалі на занятках, праводзілі практычна ў брыгадзе. Напрыклад, сяўба якасным насеннем, ворыва глыбокае і без агрэхаў, правільная і своечасовая ўборка. У 1933 годзе дзякуючы агравучобе мы правялі сяўбу ў тэрмін і добраякасна.

Рыхтуючыся да XV гадавіны ЛКСМБ мною, як сакратаром комсамольскай ячэйкі, было ўзята абавязацельства падрыхтаваць да агратэхэкзамена ўсіх комсамольцаў і частку калгаснікаў. Для гэтага райземаддзел і райком ЛКСМБ нам прыслалі агранома для правядзення вучобы.

У першы раз здалі экзамен 10 комсамольцаў. Я здаў на «выдатна» і мне выдалі значок «ЗОТ». Атрымаўшы значок, я даў абяцан не прапрацаваць з калгаснікамі тэму па жывёлагадоўлі і гароднічтву, з такім разлікам, каб здалі тэхэкзамен на «добра» не менш 20 чал. К 15 сакавіка абяцанае мною выканана. Зараз распрацоўваем тэму па свінагадоўлі.

*Рубіна,*

СТАРШЫ БРЫГАДЗІР З УЧАСТКА ФАБРЫКІ «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ».

### АЦЭНКА НА „ВЫДАТНА"

Я даўно была зацікаўлена ў павышэнні тэхнічных ведаў. Заўсёды пытала ў механікаў пра ўсё, што было мне незразумела. Пазней я пачала наведваць арганізаваны тэхгурток, тэарытычныя веды спалучала з практыкай.

Што мне дала тэхвучоба? Або гэтым, гаворыць вынікі экзамена: камісія дала ацэнку ведаў на «выдатна». Зараз я вылучана старшым брыгадзірам 3 участка на фабрыцы. Мая брыгада як у першым, так і ў другім туры конкурса брыгад на атрыманне права насіць назву нашага правадыра тав. Сталіна атрымала гэту гапаровую годнасць. У лютым і ў першай дэкадзе сакавіка брыгада перавыканала план.

Атрымалі гэта мы ў выніку павышэння тэхнічных ведаў усіх рабочых брыгады, а таксама дапамогі слабым асабіста мною, як старшым брыгадзірам.

*Ленеўскі,*

БРЫГАДЗІР ПА ЗБОРЦЫ КАМБАЙНАЎ ЗАВОДА ІМЯ ВАРАШЫЛАВА.

### ЗОТАВЕЦ ПАВІНЕН ДАПАМАГАЦЬ ІНШЫМ

На заводзе імя Варашылава працую я даволі доўгі час. Я паставіў перад сабой задачу — аўладаць тэхнікай вытворчасці. І дабіўся гэтага. У маёй брыгадзе 32 чалавекі. Я першым здаў экзамен на «выдатна».

Я зразумеў, што ізотавец не толькі працуе добра, але і дапамагае адстаючым. І я гэта выконваю. У час абедзенага перапынку арганізоўваю кансультацыю, збіраю рабочых, растлумачваю ім працэсы работы. У брыгадзе былі такія, як Шапіра, Каган, якія працавалі дрэнна. З імі работаў асобна. І дабіўся, што яны сталі лепш працаваць. Да 1-га мая брыгада абавязалася здаць тэхэкзамен на «выдатна». Я ўпэўнен, што гэты абавязак мы выканаем.

Наш завод робіць такія складанейшыя машыны, як торфкамбайны, якіх мы да 1-га красавіка павінны здаць 5 шт. Камбайны ўпяршыню выпускаюцца ў Совецкім Саюзе. Асваенне тэхналагічнага працэсу торфкамбайна дасць магчымасць пачаць серыйны выпуск гэтых машын. Я даскана вывучыў тэхналагічны працэс вырабу гэтай машыны, таму, што я пасля здачы экзамена на «выдатна» не перастаў працаваць над сабой.

На дасягнутых поспехах я не спыняюся. Прадаўжаю работу па перадачы свайго вопыту адстаючым, па далейшаму павышэнню сваіх тэхнічных ведаў.

*О. Лабкоўская*

МАТАЛЬШЧЫЦА ШОЎКАВАЙ ФАБРЫКІ.

### НАБЫТЫЯ ВЕДЫ ПЕРАДАЮ МАЛАКВАЛІФІКАВАНЫМ РАБОЧЫМ

Я паступіла на шаўковую фабрыку ў 1931 годзе. Спачатку аўладаць сваім рабочым месцам мне было вельмі цяжка і таму прыходзілася многа працаваць над сабой. Я старалася пераняць увесь вопыт работы ў старэйшых работніц. Калі арганізаваўся тэхгурток, я стала рэгулярна наведваць яго. Вучоба давалася сперва не лёгка, але потым я пачала ўсё лепш і лепш авалодваць тэхнікай сваёй работы.

Здала экзамен на «выдатна» і атрымала значок «ЗОТ». Пачала кіравыконваць свой промфінплан як па якасці, так і па колькасці. Выпрацоўваю 470-480 маткоў замест 460 у дзень. Знізіла рвань з 200 грам (дапускаемага планам) да 10-7. Была дапушчана ў конкурс на лепшую работніцу-матальшчыцу. У конкурсе заняла трэцяе месца.

Зараз свой вопыт работы перадаю адстаючым работніцам. Вось вынікі: работніца **Гадунцова** раней не выконвала план, зараз пачала выконваць. Таксама і работніца **Дземенкова** стала перадавой работніцай. Зараз я яшчэ больш буду займацца тэхвучобай. Спадзяюся атрымаць слова на ўсебеларускім злёце значкістаў «ЗОТ».

*Аўруценка*

РАБОТНІЦА ШВЕЙНАЙ ФАБРЫКІ «КОМІНТЭРН».

### Я У ЦЭХУ АДЗІНОЧКА СА ЗНАЧКОМ „ЗОТ"

Значок «ЗОТ» атрымала я праз два дні пасля здачы тэхэкзамена на «выдатна».

Калі я прышла ў цэх, мяне абступілі суседзі-работніцы **Баскіна, Сарокіна, Паіна** і інш. Пачалі пытаць, як я атрымала значок «ЗОТ». Я ім растлумачвала ўсё падробна. Мае суседкі-работніцы заявілі, што і яны будуць вучыцца ў тэхгуртку. **Блюмкіна** і **Бейліна** раней не наведвалі заняткаў, зараз рэгулярна наведваюць іх. За імі, каб не быць «апошнімі» пачалі вучыцца і астатнія работніцы.

Я пераканалася зараз, якую карысць дала мне тэхвучоба. Не гледзячы на тое, што працавала на сваёй машыне два гады, я не магла зрабіць самага дробнага рамонту і знішчыць непаладкі. Механік у тэхгуртку навучыў усяму гэтаму. Тэхвучоба адбілася і на выкананне промфінплана. У студзені я заданне выканала на 102 проц., зрабіўшы 7 пераробак, у лютым план выканала на 107 проц., даўшы толькі адну пераробку, з за 20 дзён сакавіка ў мяне няма ніводнай пераробкі.

На фабрыцы здалі тэхэкзамен толькі 10 чалавек з колькасці 1.200 рабочых. Гэта вынік таго, што нашы фабрычныя арганізацыі не зрабілі амаль нічога для налажання тэхвучобы. Толькі зараз справа паляпшаецца. Але гэта толькі пачатак. Пакуль я ў цэху з 180 чалавек адзіночка са значком «ЗОТ». Мой абавязак — дабіцца, каб у бліжэйшы час да мяне—адзіночкі прыбавіліся дзесяткі значкістаў «ЗОТ». Бяру шэфства над работніцамі Баскінай і Сарокінай.

*Канапацкі*

БРЫГАДЗІР СТРОГАЛЬШЧЫКАЎ 1-ГА ХРОМАВАГА ЦЭХА ЗАВОДА «БОЛЬШЭВІК».

### ШТО ДАЛА МНЕ ТЭХВУЧОБА

Пачаўшы займацца ў гуртку па аўладанню тэхнікай я аддаў шмат увагі на практычнае спалучэнне тэарытычных ведаў з штодзённай сваёй работай. Аўладанне тэхнікай строгальнага варштата стала асновай маёй работы. Трэба было вывучыць машыну, вывучыць усе капрызы яе.

Усе веды, атрыманыя мною ў тэхнічным гуртку і праведзеныя на практычнай рабоце далі значнае павышэнне прадукцыйнасці маёй работы. Да экзамена выконваў промфінплан на 115-117 проц. Пасля экзамена выконваю вытворчы план на **152** проц., а ў лютым — **175** проц.

Зараз я шэфствую над рабочымі **Шамесам, Зархіным, Барыбіным** і інш. На паўгадзіны раней работы і ў час абедзенага перапынку я перадаю вопыт сваёй вытворчай практыкі маладым рабочым. Рыхтую іх, каб яны да 1 мая здалі тэхнічны экзамен на «выдатна» і каб мы сумесна былі на ўсебеларускім злёце значкістаў «ЗОТ».

## НА ВЫТВОРЧЫХ УЧАСТКАХ

**МЕТАЛІЧНЫЯ ВЫРАБЫ.**

**Гомсельмаш** за 20 дзён сакавіка выпусціў 236 сіласарэзак «Універсалка» (план 205), 66 сячкарань (план 54), 128 бульбамашык (планам не прадугледжана), 35 бульбасартыровак (план 128), 170 адборачных сталоў з сеткамі (план 128), 50 канюшына-сартыровак (план 26), 3 сіласарэзкі («Інтэрнацыянал» (планам не прадугледжаны), 4143 ролікі (план 8840), 1400 вулляў (план 2560) і інш. Усяго выпушчана прадукцыі на суму 551.966 р., з іх па шырспажыву на 18.807 руб. Промфінплан за 20 дзён выканан на 102,9 проц.

**ШКЛО.**

Касцюкоўскі шклозавод імя Сталіна за другую дэкаду вырабіў 69365 кв. метраў шкла (у вазе 455 тон) на суму 208.314 руб.

Шклозавод імя Домбаля (Барысаў) выканаў промфінплан за другую дэкаду сакавіка на 99,9 проц. Выпушчана прадукцыі на суму ў 64.218 руб.

Менскі шклозавод «Пролетарый» за другую дэкаду сакавіка даў 67,5 тон шкляных вырабаў на суму 28.055 руб., або 34,7 проц. дэкаднага плана.

Шклозавод «Комінтэрн» (Бабруйскі раён) за другую дэкаду сакавіка выраблю прадукцыі на суму 37.701 руб. Промфінплан выканан на 117 проц.

Шклозавод «Окцябр» (Асіпавіцкі раён) за 20 дзён сакавіка выпусціў шкловырабаў на суму 215.322 руб., з іх па шырспажыву на 91698 руб. Промфінплан па шырспажыву выканан на 61,9 проц., па выпуску масавай прадукцыі на 76,5 проц. Брак і бой за другую дэкаду на выпрацоўцы лампавага шкла склаў 14,15, па лампавых вырабах — 7,26 і шкляных — 9,98 проц.

**АБУТАК.**

За другую дэкаду сакавіка гомельская абутковая фабрыка «Праца» выпрабіла 12.603 пары мужчынскіх бацінак (42,6 проц. дэкаднага плана), 9629 хлапчуковых бацінак (35,2 проц. задання). Усяго выраблена прадукцыі на суму 170.085 р. ці 30,25 проц. плана. За дзве дэкады выраблена 42,069 пар абутку або 61,9 проц. месячнага плана.

**ШЧОТАЧНЫЯ ВЫРАБЫ**

**ВІЦЕБСКІ ШЧОТКАМБІНАТ 21 сакавіка выканаў план першага квартала.**

Менская шчотачная фабрыка імя Крупскай за другую дэкаду сакавіка выпрабіла 42.304 шчоткі, 10.239 метраў бортавай тканіны, 2.090 кілограм мешанага воласа і 455 кілограм воласа «жылка». Усяго выпушчана прадукцыі на суму 103.076 руб., або 97,7 проц. плана.

# „УМЕЛАЯ ПАСТАНОЎКА ПАРТЫЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ ЯШЧЭ БОЛЬШ ПРАБУДЗІЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ КАЛГАСНІКАЎ, ВЫКЛІЧА ЯШЧЭ БОЛЬШЫ ПРАЦОЎНЫ ЎЗДЫМ ДЛЯ ДАСЯГНЕННЯ ЗАМОЖНАГА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ"

*(З перадавой „ПРАВДЫ")*

## ТЭРМІНОВА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РАЁНЫ З'ЕЗДАЎСКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ

Задачу забеспячэння партыйнай і комсамольскай арганізацый з'ездаўскай літаратурай кнігагандлюючыя арганізацыі не выканалі.

Усяго Партвыдатам разам з завезенай з'ездаўскай літаратурай выдана 200.000 экземпляраў. Патрэбна было гэту літаратуру размеркаваць па раёнах, выходзячы з колькаснага складу парткомсамольскіх арганізацый. Але атрымалася так, што ў некаторыя раёны завезена літаратуры больш чым трэба, а другія раёны не атрымалі патрэбнай колькасці.

У тых раёнах, дзе ёсць аддзяленні БАКТ, ДВБ, «ОГИЗ», кожная арганізацыя накіроўвала з'ездаўскую літаратуру ў свае магазіны. Затое большасць раёнаў, якіх снабжае літаратурай толькі БАКТ, атрымалі яе **ў абмежаванай колькасці.** (Жыткавічы, Асіпавічы).

Яшчэ горш справа з прасоўваннем літаратуры да калгаснікаў. Выязджаўшыя ў раёны па даручэнню Культпропа ЦК таварышы ўстанавілі, што калгаснікі Барысаўскага, Смалявіцкага, Слуцкага раёнаў ні адной з'ездаўскай брашуры не атрымалі.

Раённыя камітэты партыі зусім абмінулі справу забеспячэння працоўных з'ездаўскай літаратурай. Яны цалкам усклалі гэта на кнігарні.

Культпроп Смалявіцкага райкома комсамола звярнуў у Менск прысланую брашуру з дакладам тав. **Сталіна** ў некалькі соцень экземпляраў, матывуючы тым, што раней закуплена 140 экземпляраў і больш непатрэбна. А ў Смалявіцкай комсамольскай арганізацыі налічваецца больш 300 комсамольцаў!

Ва многіх кнігарнях (Слуцк, Барысаў і інш.) «затаваран» рад брашур са з'ездаўскімі матэрыяламі. Работнікі кніжных крам ніякай арганізацыйна масавай работы не праводзяць для прасоўвання матэрыялаў XVII з'езда ВКП(б) у шырокія масы працоўных.

Зусім нецярпіма становішча з забеспячэннем з'ездаўскай літаратурай на мовах нацменшасцей. У Асіпавічах з яўрэйскімі працоўнымі кіраўнікі прапрацоўваюць матэрыялы з'езда перакладаючы даклад тав. Сталіна з рускай мовы на яўрэйскую. Ні аднаго экземпляра на яўрэйскай мове ў Асіпавічы не паступіла. А ў Менску ў краме Партвыдавецтва ляжаць 400 экз. брашуры «Даклад т. Сталіна» на яўрэйскай мове.

Такое-ж становішча са з'ездаўскай літаратурай на яўрэйскай, польскай і іншых мовах на многіх раёнах.

У БССР жывуць працоўныя літоўцы, латышы, немцы, а кнігагандлюючыя арганізацыі не паклапаціліся завезці перакладную з'ездаўскую літаратуру.

Партвыдату, кіраўнікам кнігагандлюючых арганізацый патрэбна зрабіць паўныя вывады з такой работы сеткі кнігагандлю па прасоўванню з'ездаўскай літаратуры.

Справа кнігагандлю ў БССР пастаўлена нездавальняюча. Пастанова ЦК КП(б)Б аб кнігагандлі не выкавана. Ні БАКТ, які зай мае пераважнае месца ў кнігагандлі па раёнах, ні ДВБ не ўзмацнілі свайго кіраўніцтва магазінамі. Толькі адарванасцю ад раёнаў, адсутнасцю праверкі работы нізавых звенняў можна вытлумачыць, што ў радзе раёнаў (Лагойск, Дрыса і інш.) кніжныя крамы зачынены за адсутнасцю работнікаў.

Партвыдат павінен бездакладна выпусціць дадаткова матэрыялы з'езда і праз кнігагандлюючыя арганізацыі тэрмінова разаслаць іх у раёны.

ПАЛЕНІЧАЎ.

## ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ РАЙКОМ НЕ КІРУЕ ПАРТВУЧОБАЙ

Чырвонапольскі РК КП(б)Б не зразумеў, што пасяховае вырашэнне гаспадарчых задач можа быць толькі пры ўмове ўзбраення комуністаў і беспартыйных працоўных глыбокім веданнем рашэнняў XVII з'езда.

У партарганізацыі 90 членаў партыі, 24 кандыдаты і 3 спачуваючых. А партвучобай ахоплена толькі 62 члены партыі, 18 кандыдатаў.

Большасць партшкол прыступіла да заняткаў у студзені. За гэты час праведзена ўсяго 3 заняткі. **Берадзяцкая, Козбудская, Новальянская** кандыдацкія школы зусім распаліся.

Падборам прапагандыстаў з лепшых, больш падрыхтаваных комуністаў, райком не займаецца.

У соўгасе імя Калініна прапагандыстам вылучан тав. **Краўцоў,** — самы недысцыплінаваны комуніст, які часта замест заняткаў наладжвае п'янкі з слухачамі.

Прапагандыстам кандыдацкай школы ў Палужскім сельсавеце быў вылучан **Лемяшонак,** які выключаўся з партыі за антыпартыйныя ўчынкі.

Рашэнні XVII з'езда ВКП(б) прапрацоўваюцца вельмі дрэнна. Некаторыя партшколы яшчэ не прыступілі да прапрацоўкі даклада тав. **СТАЛІНА** (Бярозакі, Козбуда). У большасці партшкол за ўвесь час праведена па 1-2 заняткаў. Прапрацоўка праходзіць на вельмі нізкім палітычным узроўні. Самі прапагандысты слаба разумеюць значэнне пытанняў, пастаўленых XVII з'ездам ВКП(б) і часта даюць няправільныя, блытаныя тлумачэнні.

Частка комуністаў яўна ігнаруе вывучэнне матэрыялаў XVII з'езда. Тав. **Дымшас,** старшыня месцачковага совета, на нарадзе проста заявіў, што ён не будзе вывучаць матэрыялаў з'езда. І на гэта, на сутнасці антыпартыйнае, выступленне, райком не рэагаваў.

Раённы камітэт партыі павінен зараз-жа прыняць меры для наладжання работы сеткі партасветы, падабраць для яе лепшых прапагандыстаў. Кожны інструктар райкома павінен штодзённа аператыўна кіраваць работай партшколы.

СЕДАЙ.

## Тов. МЫШАРЦАЎ — ПРЫКЛАДНЫ ПРАПАГАНДЫСТ

Марксісцка-ленінскай вучобе, прапрацоўцы матэрыялаў XVII з'езда **Касцюковіцкі** райком КП(б)Б аддаў шмат увагі.

Ахоплена партвучобай 210 членаў партыі, 140 кандыдатаў, 27 спачуваючых і 349 беспартыйных. Арганізавана і бесперабойна працуе 29 кандыдацкіх школ, 2 пачатковыя школы ленінізма, марксісцка-ленінскі гурток, вячэрняя соўпартшкола, дэкадны семінар райпартактыва і семінар прапагандыстаў.

Адной з лепшых з'яўляецца **Нізкаўская** кандыдацкая школа (кіраўнік т. **Мышарцоў,** ён-жа сакратар партарганізацыі). Заняткі ў яго пачаліся з 20 ліпеня 1933 г. За ўвесь час яны ні разу не сарваліся. Школу наведваюць 4 парторгі, 7 старшынь калгасаў, 3 члены прэзідыума сельсовета, 3 настаўнікі, 2 члены праўлення сельпо, некалькі беспартыйных калгаснікаў-ударнікаў і рахункаводы калгасаў. Цяпер у школе ўвесь час ідзе прапрацоўка матэрыялаў XVII з'езда.

Заняткі ў школе т. Мышарцоў спалучыў з практычнай работай слухачоў, цесна ўвязаў прапрацоўку матэрыялаў з'езда з практычнымі пытаннямі работы тых калгасаў, сельсовета, кааперацыі, у якіх слухачы працуюць.

13 слухачоў кандыдацкай школы прэміраваны за ўдарную работу. 11 слухачоў вылучана у якасці групавых агітатараў для вядзення партмасавай работы ў калгасных брыгадах.

Нядрэнна працуе і кандыдацкая школа соўгаса **Самацэвічы.** У школе наладжан вучэбны парадак і створана спрыяючая абстаноўка для работы. Усе слухачы забяспечаны з'ездаўскай літаратурай, пад ручнікамі і сшыткамі.

Зусім нездавальняюча пастаўлена вучоба партактыва. Дэкадны семінар для райпартактыва наведваюць толькі 35-40 проц. слухачоў. Сарвана работа месячных курсаў прапагандыстаў. Пасля 15-дзённай работы райком зняў загадчыка курсамі і паслаў яго на вёску. А новы загадчык не прызначан.

КАСЦЮК.

# XVII З'ЕЗД ПАРТЫІ І ЗАДАЧЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ

## (З даклада тав. ПОСТЫШЭВА на другім абласным злёце рабселькораў Харкаўшчыны 20 сакавіка 1934 г.)

### Што значыць зараз чэсная калгасная праца?

Каб зрабіць нашу калгасную вёскую гаспадарку ва ўсіх адносінах самай культурнай, самай перадавой, патрабуецца яшчэ вельмі настойлівай большэвіцкай методзенай работы.

Мы за мінулы год дабіліся таго, што ў нас падняслася працоўная дысцыпліна сярод калгаснікаў, пагрэмілі мы ворага вельмі моцна, у сім-тым нам удалося перабудаваць нашы сельскія арганізацыі. Сур'ёзнейшую станоўчую ролю адыгралі палітаддзелы МТС у барацьбе за большэвіцкія калгасы.

Але гэтага зараз мала. **Мы павінны зараз падняць нашу калгасную гаспадарку на новую, больш высокую ступень, а для гэтага нам самім у першую чаргу трэба працаваць па-іншаму, па-новаму.**

На XVII з'ездзе тав. **Сталін** паставіў перад партыяй, перад усёй краінай рад сур'ёзных задач у галіне сельскай гаспадаркі. Ён гаварыў аб задачы значнага павышэння ўраджайнасці калгасных і соўгасных палёў. Ён гаварыў пяцігадоўскім калгаснікам, што і 10-12 кілограмаў, якія яны атрымалі ў 1933 годзе, мала-мала можна атрымаць значна больш, калі па-сапраўднаму разгарнуць калгасную гаспадарку.

Асабліва рэзка тав. **Сталін** паставіў пытанне аб жывёлагадоўлі. Нам трэба не толькі прыпыніць надзенне стада, але дабіцца таго, каб жывёлагадоўля аднаўлялася, расла. А гэта дача нялёгкая. Тут патрэбна мужная, упартая, настойлівая барацьба, моркасць, пільнасць большэвіцкая патрэбна.

Ад каго залежыць вырашэнне ўсіх гэтых задач? Ад людзей, ад працоўных, ад калгаснікаў, ад рабочых і ў першую чаргу ад перадавых людзей, ад вас з вамі, ад арганізатараў найнізейшых калгасных мас.

**Вырашыць тыя задачы ў галіне сельскай гаспадаркі, якія паставіў перад нас тав. Сталін, мы зможам, толькі падняўшы на новую, нязмерна больш высокую ступень усю нашу работу. Нам трэба з вамі біцца за тое, каб усе нашы калгасы былі большэвіцкімі, моцнымі, магутнымі, каб усе нашы калгаснікі былі заможнымі, каб усім нашым рабочым забяспечыць заможнае жыццё. Гэта справа гонару кожнага з нас.**

Само паняцце: чэсная і добрасумленная праца калгаснікаў, павінна ў гэтым годзе быць іншым, чым у мінулым. У мінулым годзе мы рабілі галоўны ўпор на тым, што калгаснікам трэба ўсім і своечасова выходзіць на работу і захоўваць правілы ўнутранага распарадку. Усё гэта захоўвае сваю сілу і цяпер. Але гэтага мала.

Зараз пытанне аб чэснай, добрасумленнай працы калгасніка мы павінны ставіць па-новаму. Галоўны ўпор мы павінны рабіць не толькі на поўным і своечасовым выхадзе калгаснікаў на работу, а ў першую чаргу на выкананні і перавыкананні норм выпрацоўкі.

Але і гэтага мала. Не толькі выконваць норму, але і дабівацца высокай якасці. Трактарыст выконвае нормы ворыва, але выконвае вельмі дрэнна, шмат агрэхаў дапускае, мелка арэ. Такое выкананне нормы нам не патрэбна. Нам патрэбна выкананне якаснае, без агрэхаў, сапраўднае глыбокае ворыва там, дзе гэта патрабуецца згодна агратэхнічных правіл.

Потым нам трэба як мага паўней скарыстаць сельска-гаспадарчыя машыны, іх магутнасць і магутнасць усяго сельска-гаспадарчага інвентара, а то-ж мы скарыстоўваем яго цяпер на 40-50 проц. Зараз нам трэба ставіць пытанне такім чынам, каб машыны скарыстаць поўнасцю.

Нам трэба таксама дабіцца таго, каб калгаснікі асвоілі новую тэхніку калгаснай сельскай гаспадаркі. Вось галоўнае зараз, што па-сапраўднаму, правільна акрэсліваё чэсныя, добрасумленныя адносіны да калгаснай працы.

### Уваходзіць у найдрабнейшыя дэталі калгаснай вытворчасці

Для таго, каб рабселькоры моглі мабілізаваць і арганізаваць шырокія масы калгаснікаў і калгасніц на вырашэнне гэтых складаных задач, яны самі ў першую чаргу павінны ўлязаць у самыя найдрабнейшыя дэталі агратэхнікі, тэхніцы і арганізацыі калгаснай вытворчасці. Яны — арганізатары калгаснай справы, перадавыя людзі калгаса, а арганізатары калгаснай справы самі ў першую чаргу павінны аўладаць гэтай тэхнікай і гэтай арганізацыяй. Ваша мова тады будзе больш вострым, упэўненым і вока больш зоркім.

Ні адна сельская гаспадарка ў свеце не мае такіх магчымасцяй стаць найкультурнейшай гаспадаркай, як наша.

Ужо зараз пачынаюць нараджацца і развіваюцца новыя формы і метады барацьбы рабселькораў за культурную, высокапрадукцыйную калгасную гаспадарку. Я маю на ўвазе такія формы, як правядзенне тэхнічнага экзамена сярод калгаснікаў, які разгарнуўся ў нашай вобласці па пачыну Міргарадскай МТС, як агранамічныя з'езды калгаснікаў, арганізаваныя ўпершыню ў нашай вобласці па ініцыятыве селькораў Кременчугскага раёна. Я маю на ўвазе і такую новую форму работы селькораў, як жаночыя інспекцыі па якасці, арганізаваныя ўпершыню ў нашай вобласці па ініцыятыве селькораў калгасніц Лохвіцкага раёна, дзе лік калгасніц-інспектароў па якасці даходзіць да 600.

Гэта першыя парасткі. Трэба гэтыя новыя формы ўсяляк вітаць і заахвочваць, распыраць. Трэба наладзіць абмен вопытам. І не толькі ўнутры нашай вобласці. Чаму-б не звязацца з другімі абласцямі, перадаць ім свой вопыт, абмяняцца вопытам?

Я прапанаваў-бы селькорам прымяніць яшчэ адну форму работы. Прыязджаеш у калгас — там ёсць і палявод, і селькор, і комсамольцы, і ўдарнікі — перадавыя калгаснікі, беспартыйныя і партыйныя. Але няма ў іх культурнага ачага. Я раю вам узацца за гэту справу. У кожным калгасе можна знайсці добрую хату. Адрамантуйце яе і зрабіце гэту хату свайго роду лабараторыяй. Падбярыце ў спецыяльных скрыначках усе культуры, які сее даны калгас, — зернавыя, тэхнічныя травы. Падбярыце плакаты навуковыя па агранаміі і экспанаты розныя. Створыце магчымасць рабіць у гэтай, няхай прымітыўнай, але ўсё-ж лабараторыі, вопыты з зярном на ўсхожасць.

На што трэба селькорам звярнуць асаблівую ўвагу з першых-жа дзён сяўбы? У першую чаргу на тое, каб **ворага не дапускаць к калгаснай справе.** А яго яшчэ пакуль нямала і ў саміх калгасах, і ў МТС, і ў органах дзяржаўнай улады на сяле. Не дапускаць ворага, выкрываць ворага, весці з ім самую жорсткую барацьбу — гэта **першае і галоўнае.** Але гэта не ўсё. Адначасова з гэтым нам трэба забяспечыць таксама і неабходныя арганізацыйна-гаспадарчыя мерапрыемствы і ў першую галаву **хуткую тэхнічную дапамогу ў полі,** каб у нас не стаялі трактары, плугі, каб адразу-ж падправіць, падрамантаваць машыну ў выпадку паломкі. А потым трэба дабіцца, каб паломак наогул было як можна менш.

Вы ні ў якім выпадку не павінны праходзіць міма такіх фактаў, калі машына стаіць лішнюю гадзіну, калі трактарыст спіць замест таго, каб працаваць, балтаецца без справы, неахайна абыходзіцца з трактарам, калі бочку з газай засмечваюць, запраўляюць бруднай газай машыну, крадуць газу.

Вось тут вам трэба бічаваць. Біце людзей, дапускаючых такія з'явішчы, моцна, не бойцеся. Адначасова паказвайце лепшых людзей, герояў, чэсных тружанікаў, перадавікоў.

**Наглядайце за арганізацыяй своечасовага адпачынку і кармёжкі каня.** У нас-жа каня часта своечасова не кормяць, не пояць, не распрагаюць для адпачынку. Беражыце каня. Таго, хто дрэнна адносіцца да каня, моцна бічуйце. Таго, хто добра адносіцца да каня, паказвайце. Вока селькора тут павінна быць асабліва зоркім.

Неабходна весці жорсткую барацьбу з малейшымі парушэннямі працоўнай дысцыпліны, а спроб парушыць яе будзе нямала. Гэта можна загадзя сказаць. Ваша роля тут аграмадная, вы павінны дабіцца, каб правілы ўнутранага распарадку былі законам для кожнага калгасніка.

Вам трэба **паставіць перад сабой рад задач і ў галіне культурнай работы на сяле.** Культурная абстаноўка на сяле і ў табары і работу робіць культурнай. А ўсякая культурная работа — гэта моцная дысцыпліна, арганізаванасць высокая ў часе работы і адпачынку.

**Цяпер — аб рабкорах.** Задачы рабкораў выцякаюць з той асноўнай установкі, якую мае наша прамысловасць, — асвоіць і перавысіць праектную магутнасць заводаў, асвоіць новыя тэхналагічныя працэсы, новыя віды прадукцыі і значна павысіць якасць прадукцыі.

Асабліва я хацеў-бы спыніцца на пытаннях **чыгуначнага транспарта.** XVII з'езд партыі моцна паставіў перад усімі намі пытанне аб транспарце, асабліва аб чыгуначным. Мы ўсе павінны зрабіць для сябе вывады з указанняў XVII з'езда і з апошняга рашэння Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб рабоце Данецкай чыгункі. І ў першую чаргу, зразумела, павінны гэтыя вывады для сябе зрабіць рабкоры чыгуначнага транспарта.

Я лічу, што рабкоры-чыгуначнікі сапраўднай барацьбы за рашэнні ЦК ВКП(б) і XVII з'езда партыі аб чыгуначным транспарце яшчэ не разгарнулі. Адна з прычын адставання чыгуначнага транспарта — гэта тое, што слаба згуртаван актыў. Як працуюць на чыгунках газеты са сваімі рабкорамі? Напрыклад, «Гудок», газеты паасобных дарог? Працуюць дрэнна. Трэба гэта прама сказаць.

Нашы абласныя, гарадскія і раённыя газеты не дапамагалі чыгуначным газетам арганізаваць рабкораў-чыгуначнікаў. Ці трэба вам гаварыць аб той велізарнай ролі, якую рабкоры адыгрываюць іменна на чыгунцы, на ўсіх гэтых раз'ездах, маленькіх станцыях. Роля рабкораў на чыгунцы выключная, а арганізацыя работы іх няважная, зусім дрэнная.

Ясна, што адставанне рабкораў на чыгуначным транспарце адшымі сіламі саміх чыгуначнікаў нам не зжыць. Мы ўсе павінны дапамагчы ім. Газета, абласны камітэт, раённыя партыйныя камітэты, рабкоры буйных фабрык і заводаў — усе павінны за гэту справу ўзяцца.

### Дзесяць асноўных задач перабудовы рабселькораўскага руху

**Для таго, каб яшчэ вышэй узняць актыўнасць рабселькораў у вырашэнні сацыялістычных задач, неабходна перабудаваць формы кіраўніцтва і работы з рабселькорамі.** У чым павінна заключацца гэта перабудова?

**Першая задача — знішчыць функцыяналку ў кіраўніцтве рабселькораўскім рухам.** Тут, аказваецца, таксама нямала функцыяналкі. Вось, напрыклад, шматтыражка ХПЗ. Называецца яна «Хар каўскі паравознік». У рэдакцыі заводскай шматтыражкі існуе спецыяльны аддзел—«Бюро дзейснасці рабочых пісем». Спецыяльны маса вы аддзел, г. зн. па сутнасці аддзел рабкораў. Як быццам у такой газеце можа быць нейкая яшчэ не рабочая карэспандэнцыя. З функцыяналкай трэба пакончыць не толькі ва ўстановах, але і ў кіраўніцтве рабселькораўскім рухам.

**Другая задача заключаецца ў тым, каб карэспандэнцыі рабселькораў зрабіць асноўным матэрыялам нашых нізавых органаў друку.** У нас у некаторых газетах ёсць на ўсе рукі майстры. Такі спец за дваццаць мінут можа накатаць любы артыкульчык на любую тэму, аж да руху вятроў на такіх вышынях стратасферы, куды ніхто яшчэ і не залятаў. **(Смех).**

Я нядаўна атрымаў пісьмо. Ёсць у нас газета «Червона Тульчынщина» у Вінніцкай вобласці. Тут існуе такая сістэма: супрацоўнік газеты піша 5-8 заметак адразу аб сабраных ім фактах у розных калгасах і здае сакратару рэдакцыі. Сакратар апрацоўвае гэтыя заметкі і дае іх у газету пад рознымі выдуманымі прозвішчамі. У нумары газеты 6 сакавіка паласа аб падрыхтоўцы да вясны была напісана 2 супрацоўнікамі рэдакцыі — Васілеўскім і Мазурам. У гэтай паласе 9 заметак пад рознымі подпісамі, і несвядомлены чытач можа падумаць, што гэта пісалі розныя людзі. **(Смех).**

К чаму гэта «очковтирательство»? Трэба з гэтым пакончыць, трэба ўзняць удзельную вагу рабселькораўскага матэрыяла ў нашых газетах.

**Трэцяя задача заключаецца ў тым, каб узмацніць рэагаванне на рабселькораўскія заметкі.** Гэта адносіцца да газет цэнтральных, абласных, да пракуратуры, заводакіраўніцтваў і т. д.

Ясна, што калі і змяшчаць рабселькораўскія заметкі, ды на іх не рэагаваць, то газетная работа наогул ператвараецца ў пустую бал батню.

**Чацвертая задача заключаецца ў тым, каб значна ўзмацніць сувязь нашых газет з рабселькорамі.** Некаторыя газеты даюць у гэтых адносінах вельмі добрыя ўзоры. «Більшовик Полтавщини», напрыклад, арганізаваў індывідуальную перапіску з селькорамі, разаслаў індывідуальныя пісьмы дэлегатам раённых злётаў, жаночых калгасных злётаў і т. д. Усе работнікі рэдакцыі вядуць перапіску з пэўнай групай селькораў. У рэзультаце гэтай перапіскі «Більшовик Полтавщини» выхаваў дзесяткі лепшых людзей з перадавых селькораў, выхаваў рэдактароў калгасных газет. Я лічу, што гэтыя формы і метады работы з рабселькорамі трэба вітаць, трэба іх усяляк развіваць.

**Пятае. Трэба рэзка змяніць існуючае становішча з вылучэннем рабселькораў на газетную работу.** Мы тут вельмі мала зрабілі. Мала працуюць над павышэннем кваліфікацыі рабселькораў і зусім нязначную колькасць рабселькораў вылучаюць на спецыяльна газетную работу. На вёсцы асабліва дрэнна абстаіць з арганізацыяй розных семінараў і курсаў.

Што датычыць вылучэння рабселькораў на адказную газетную работу, то трэба вам сказаць, што тут аказваюць бюракратычнае супраціўленне асобныя групы штатных работнікаў нашых газет. Калі рабселькор і пападае ў апарат рэдакцыі нашых раённых і асабліва гарадскіх, абласных і цэнтральных газет, то ён звычайна застравае на ніжэйшых ступенях.

**Шостае. Трэба значна ўзмацніць барацьбу з праследваннем рабкораў і селькораў.** За апошні час мы мелі рад фактаў праследвання рабселькораў. Напрыклад, рэдакцыя блізнецоўскай газеты атрымала ад селькораў некалькі пісем з папярэджаннем, што калі яна будзе змяшчаць пад заметкамі іх прозвішчы, то яны кінуць зусім пісаць, бо ім пагражаюць. Гэта гаворыць аб запалоханасці селькораў. А раз ёсць запалоханасць, няўпэўненасць, значыць людзей не абараняюць. Мы павінны дабіцца таго, каб гэтыя людзі смелымі былі. Трэба зрабіць так, каб кожны рабселькор быў упэўнен, што яго крытыка, яго выкрыцці знойдуць належны водгук, што вінаватыя будуць пакараны і што ад прахадзімцаў, здавеяў, жулікаў і класавага ворага яго абароняць.

**Сёмая задача заключаецца ў тым, каб умацаваць парткіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.** Паслалі мы ў Вінніцкі гарком таварыша. Запытаў ён у загадчыка культпропам гаркома: якія фабрычна-заводскія газеты ён лічыць у Вінніцы самымі лепшымі? Загадчык упэўнена заявіў, што лепшымі з'яўляюцца газета суперфасфатнага завода і газета швэйнай фабрыкі імя Валадарскага. Пры праверцы-ж аказалася, што на суперфасфатным заводзе ўжо 3 месяцы няма рэдактара, а газету рэдагуе беспартыйны сакратар рэдакцыі, прычым у нумары газеты, прысвечаным гадавіне Чырвонай арміі, былі сур'ёзныя палітычныя памылкі. Што датычыць газеты швэйнай фабрыкі, то яна ў апошні час наогул не выходзіць. **(Смех).** Вось бачыце, як культпроп вінніцкага гаркома ведае свае заводскія газеты. І я думаю, што не адзін ён у нас такі.

**Восьмая задача — устанавіць добрыя ўзаемаадносіны палітаддзельскіх газет з раённымі газетамі.** У некаторых мясцах гэтыя ўзаемаадносіны нікуды не варты. Вось прыклад. У раённай газеце Блізнецоўскага раёна 1 лютага была змешчана заметка аб тым, што ў калгасе імя Леніна коні ў дрэнным стане. Былі ўказаны прозвішчы вінаватых. Праз 4 дні змяшчаецца заметка ў палітаддзельскай газеце гэтага-ж раёна аб тым, што ў калгасе імя Леніна лепшыя коні, і тыя-ж прозвішчы ўказваюцца, але не як віноўнікаў дрэннага стану коняй, а як лепшых ударнікаў. **(Смех).** Нельга так. Ясна, што гэтыя газеты адна другую дыскрэдытуюць. Хто хлусіць, будуць гаварыць калгаснікі, цяжка зразумець, лепш абодвум не верыць. **(Смех).**

**Дзевятая задача — узмацненне работы з юнкорамі, з дзяткорамі.** У апошні час у школах, і ў сельскіх і ў гарадскіх, прыкметна ўзмацнілася работа контрэволюцыйных элементаў. Нацыяналістычныя элементы за кардонам і ў нас тут прызываюць да барацьбы «за душу молаці», «за душу дитини». Яны гавораць, што ім трэба стаўку рабіць на «молодь». Нацыяналістычныя элементы, якія сядзяць яшчэ ва многіх нашых школах, стараюцца ўкараніць у свядомасці дзяцей усякія контррэволюцыйныя, шавіністычныя ідэі, закіраваныя супроць сацыялізма. Яны нярэдка натраўляюць дзяцей адны на другіх, на піонераў, усяляк запалохваюць дзяцей-перадавікоў, стараюцца культываваць хуліганскія выхадкі сярод дзяцей, прабуюць разлагаць дзяцей усялякімі метадамі.

Трэба нам выявіць варожыя элементы ў школах, і тут нашы рабселькоры, дзяткоры, юнкоры могуць і павінны адыграць вельмі сур'ёзную ролю.

**І апошняя — самая важная задача перабудовы — гэта значнае ўзмацненне праверкі выканання.** Тут работа нашых газет павінна ісці ў цяснейшым кантакце з работай Камісіі Партыйнага і Совецкага Кантроля і з работай комсамольскай «лёгкай кавалерыі». Гэта датычыць праверкі другіх. Але нашаму друку трэба правяраць і сябе. А гэта-ж самае слабае месца ў рабоце нашых газет.

Неабходна дакладная праверка фактаў, паведамляемых газеце для друку. Апрача таго, трэба правяраць рэагаванне пракуратурай і іншымі органамі ўлады на пісьмы і заметкі рабселькораў. Даводзіць трэба справу да канца і дабівацца, каб выкрыты вораг, жулік, злодзей, бюракрат быў сапраўды выгнан і зганьбован.

Але асноўнае зараз, самае важнае — гэта паспяховае правядзенне веснавой сяўбы. **Усё павінна быць зараз пастаўлена на службу сяўбе.** Мы павінны ў гэтым годзе правесці так сяўбу, забяспечыць такі ўраджай, які даў-бы нам магчымасць закончыць хлебапастаўкі да окцябрскіх свят, і ўсе калгасы, усе калгаснікі нашай вобласці павінны быць з дастатковай колькасцю хлеба. Мы павінны ў гэтым годзе дабіцца таго, каб усе калгаснікі былі забяспечаны сваім хлебам да новага ўраджаю, каб усе калгасы былі з насеннем, з чыстым, добрым насеннем і канцэнтраванымі кармамі для жывёлагадоўлі і ў першую чаргу для коняй і каб, звыш усяго гэтага, яны мелі яшчэ і ліпкі. Гэту задачу мы павінны ў гэтым годзе рашыць ва што-б там ні стала.

**(Бурныя апладысменты, усе ўстаюць).**

---

### У дапамогу прапагандысту

# СОЦЫЯЛІЗМ І ПЫТАННІ РОЎНАСЦІ *)

I.

У сваім дакладзе на XVII партз'ездзе т. Сталін спыніўся на разе пытанняў, па якіх сярод некаторай часткі членаў партыі яшчэ сустракаецца блытаніна. У гэтай сувязі ён даў выключна яркую і вялікую распрацоўку праблемы роўнасці і соцыялізма прыстасоўна да сучаснай эпохі барацьбы за поўную набудову бяскласавага, соцыялістычнага грамадства. Распрацоўка гэтага пытання ў т. Сталіна ўспрымае на вышэйшую ступень гэта важнейшае звяно марксісцка-ленінскага вучэння аб соцыялізме. Барацьба т. Сталіна супроць дробнабуржуазных рэакцыйна-утапічных «ураўніцельных» уяўленняў аб соцыялізме з'яўляецца прямым працягам той барацьбы супроць «ураўніцельных» утопій, якую вялі Маркс і Энгельс, і той барацьбы, якую нястомна вёў Ленін супроць соцыял-здрадніцкай і ліжэпросць соцыял-здрадніцкай агентуры дакыльнай» лявацкай агентуры буржуазіі. Адна лінія, адна выцыпловая ўстаноўка праходзіць чырвонай ніткай праз доўгі рад гістарычных дакументаў пролетарскага соцыялізма, пачынаючы ад «Немецкой идеологии» і «Коммунистического манифеста» аж да апошніх работ т. Сталіна.

Ужо ў «Немецкой идеологии» Маркс і Энгельс выкрываюць дробнабуржуазныя ўраўніцельныя ўяўленні аб комунізме. Яны даюць глыбокую крытыку поглядаў Максімільяна Штырнера — аднаго з асноваў Штырнера — аднаго з асноваў ложнікаў анархізма, падкрэсліваючы, што «ўвесь комунізм зводзіцца святым Максам да роўнай заработнай платы 1).

Уяўленням ідэолага дробных уласнікаў, якім з'яўляўся Штырнер з яго абмежаваным кругаглядам, асноваположнікі навуковага комунізма процістаўляюць пролетарскае разуменне сутнасці комунізма як знішчэння класаў. Фантазія дробнага буржуа не ідзе далей такіх рэчаў, як «роўная заработная плата», або «чэсна заробленае давольства»; дробны буржуа не бачыць шляхоў для карэннай рэволюцыйнай перабудовы грамадскіх адносін; для яго гутарка можа ісці толькі аб утапічных праектах «рэформы» існуючага ладу з захаваннем яго асноў у выглядзе прыватнай уласнасці і распыленай працы. Гэтым уяўленням марксізм процістаўляе шлях знішчэння самой асновы «ўсёй гэтай процілегласці паміж працай і давольствам». 2).

Аграмадную ролю ў правільным навуковым абгрунтаванні ўяўленняў аб соцыялізме, мае барацьба Маркса і Энгельса супроць дробнабуржуазнага соцыялізма, прапаведуемага Прудонам і яго паслядоўцамі. Ідэі прудонізма жывы да гэтага часу; сучасны II інтэрнацыянал, падбіраючы ідэйную спадчыну ўсіх павержаных Марксам і Энгельсам дробна-буржуазных рэакцыйных ідэолагаў, асабліва стараецца выкарыстаць у сваёй гаспадарцы прудонаўскую прамудрасць, некалькі «асвяжыўшы» яе.

У той-жа час пруданіецкія адкравенні фігуруюць і ў сучаснай фашысцкай ідэалогіі. Маркс паказаў, што прудонаўскі «соцыялізм» базуецца на ўтапічным імкненні дробнага буржуа (усё больш і больш размолваемага жорнамі капіталізма) захаваць і ўмацаваць сваю самастойнасць, захаваць «добрыя» бакі капіталізма, знішчыўшы яго «дрэнныя» бакі. Маркс і Энгельс бязлітасна і ў тэорыі і на практыцы змагаліся з рэакцыйнымі дробнабуржуазнымі прудонаўскімі ідэямі соцыялізма.

У 70-х гадах Марксу і Энгельсу прышлося змагацца з новым выданнем рэакцыйна-ўтапічных уяўленняў аб «роўнасці», выступаючым пад сцягам «права на поўны прадукт працы». Ласальянцы прабуюць гальванізаваць утапічны погляд наконт гэтага, і Маркс у сваёй бяссмертнай «Критике Готской программы», разбівае нагалаву гэтыя спробы, даючы ў той-жа час глыбокую дыялектычную, адзіна правільную распрацоўку праблемы роўнасці.

Маркс паказвае негрунтоўнасць раду палажэнняў Готскай праграмы, адлюстроўваючых ласальянскія ўяўленні аб роўнасці. «Даход ад працы цалкам належыць усім членам грамадства на роўных правах», — гаварылася ў праграме. Другі тэзіс гаварыў аб «справядлівым размеркаванні працоўнага даходу». Маркс указвае, што «працоўны даход» — гэта збіўчывае ўяўленне, якім Ласаль прабуе замяніць пэўныя эканамічныя катэгорыі. «Што такое «справядлівае размеркаванне? — задае пытанне Маркс і раскрывае ўсю беззмястоўнасць гэтага туманнага і збіўчывага выразу.

Маркс ускрывае ўсю негрунтоўнасць цэнтральнага тэзіса аб тым, што «даход ад працы цалкам належыць усім членам грамадства на роўных правах». Перш за ўсё ён ускрывае яго ўнутраную супярэчлівасць. Калі «працоўны даход» размяркоўваецца паміж «ўсімі членамі грамадства», у тым ліку і непрацуючымі, то ясна, што працуючыя тады не атрымаюць «няўрэзанага працоўнага даходу». Калі-ж прадукт размяркоўваецца толькі паміж працуючымі, то тады нельга гаварыць аб «роўных правах». Маркс канкрэтна паказвае, што з савакупнага прадукту гадавой працы перш за ўсё робіцца рад вылікаў для мэт самой вытворчасці (кам пенсацыяй спажытых сродкаў вытворчасці, сродкаў для пашырэння вытворчасці, рэзервовы страхавы фонд); што-ж датычыць той часткі прадукта працы, якая прызначана для спажывання, то перш чым яна падвергнецца індывідуальнай дзяльбе, з яе таксама робіцца рад вылікаў (выдаткі кіраўніцтва, задаваленне грамадскіх патрэб, фонд на ўтрыманне непрацаздольных).

Але Маркс не спыняецца на гэтым у сваім аналізе. Ён ставіць канкрэтна пытанне аб тым, як будзе размяркоўвацца грамадскі прадукт у першай фазе комунізма —у соцыялістычным грамадстве, дзе ўжо ліквідавана эксплаатацыя чалавека чалавекам, дзе прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці заменена грамадскай, дзе зні шчаны класы. Пры гэтых умовах кожны работнік — за вылікам той часткі прадукта, якая ідзе на ўсе грамадскія патрэбы — атрымлівае ад грамадства толькі ў другой форме такую-ж колькасць працы, якую ён даў грамадству.

**«Гэта роўнае права** ўсё яшчэ ўціснута ў буржуазныя рамкі. Права вытворцаў **прапарцыянальна** дастаўляемай імі працы: роўнасць заключаецца ў тым, што вымярэнне праводзіцца **роўным мярылам — працай.** Але адзін чалавек фізічна або разумова перавышае другога, а значыцца, і дастаўляе за тойжа час большую колькасць працы: або здолен працаваць больш: а для таго, каб праца магла служыць мярылам, яна павінна быць вызначана па сваёй працягласці або па сваёй інтэнсіўнасці, у адваротным выпадку яна перастала-б служыць мярылам. Гэта **роўнае** права ёсць няроўнае права для няроўнай працы. Яно не прызнае ніякіх класавых адрозненняў, таму што кожны з'яўляецца толькі рабочым, як і ўсе іншыя. Але яно моўчкі прызнае натуральнымі прывілеямі няроўную індывідуальную адаронасць, а значыць і няроўную-ж працаздольнасць. **Таму яно па свайму зместу з'яўляецца правам няроўнасці, як і наогул усякае права» 3).**

У рэальнай сапраўднасці людзі няроўны, неадпольлкавы: больш моцнаму і спрытнаму тая-ж самая праца даецца лягчэй чым слабому або нездольнаму, сямейны мае больш патрэб чым адзіночка і т. д. Замест агульных разважанняў аб роўнасці, Маркс канкрэтна выясняе той рэальны змест, які толькі і можа мець патрабаванне роўнасці ва ўмовах соцыялізма. На другой, вышэйшай стадыі комуністычнага грамадства, «калі праца перастане быць толькі сродкам для жыцця, а стане самай першай патрэбай жыцця», калі «ўсе крыніцы грамадскага багацця пальюцца поўным патокам», грамадства адкідвае ўсе астаткі «буржуазнага права» і піша на сваім сцягу: «Кожны па здольнасцях, кожнаму па патрэбнасцях». Натуральна, што і да гэтай фазы ніколькі не падыходзіць абстрактнае, агульнае прадстаўленне аб роўнасці, народжанае зусім іншай соцыяльнай абстаноўкай.

У другой палове 70-х гадоў сярод маладога неакрэпшага рабочага руху Германіі пачынаюць пашыравацца ідэі Дзюрынга — вычварная мешаніна з абрыўкаў цэлага раду дробнабуржуазных утапічных сістэм. Супроць гэтай ідэалагічнай заразы выступае Энгельс, з адабрэння і пры дзейным удзеле Маркса. Як заўзяты дробна-буржуазны блытанік, Дзюрынг робіць абстрактную ідэю «роўнасці» адным з сваіх улюбёных канькоў. Энгельс у «Анти-Дюринге» падрабязна разбірае яго адкравенні наконт гэтага. Ён паказвае ўсю негрунтоўнасць агульнага і абстрактнага лозунга роўнасці, ускрывае ўсю смехатворнасць дзюрынгаўскіх патуг даказаць нейкую «натуральную» роўнасць людзей, узятых па-за якойбы там ні было соцыяльнай абстаноўкай, а дае майстэрскую матэрыялістычную характарыстыку таго рэальнага зместу, які ўкладаўся ў паняцце роўнасці ў розныя эпохі грамадскага развіцця. Асаблива падрабязна Энгельс характарызуе пры гэтым, з аднаго боку, буржуазнае разуменне роўнасці і, з другога — пролетарскае патрабаванне роўнасці. У якасці выводу з свайго даследвання Энгельс указвае, што «рэальны змест пролетарскага патрабавання роўнасці зводзіцца да патрабавання **знішчэння класаў.** Усякае патрабаванне роўнасці, якое ідзе далей гэтага, немінуча прыводзіць да бязглуздзіцы». 4).

Дробнабуржуазныя «соцыялісты» часоў Маркса і Энгельса будавалі ўсякага роду «соцыялістычныя» сістэмы размеркавання, зусім не разумеючы таго, што размеркаванне ёсць адзін з момантаў вытворчасці, агульным строем якой яно акрэсліваецца і адзін з бакоў якой яно прадстаўлае. Але і сучасныя буржуазныя праціўнікі соцыялізма, як і соцыял-фашысцкія прапаведнікі ілжэсоцыялістычных поглядаў, прабуюць вытлумачыць соцыялізм выключна як «праблему размеркавання». Адрываючы размеркаванне ад вытворчасці, яны прабуюць дэмагагічнымі фразамі наконт «больш справядлівага» размеркавання адцягнуць увагу пролетарыята ад неабходнасці карэннага перавароту ў адносінах вытворчасці, зруйнавання капіталістычнага спосабу вытворчасці і стварэння новага, соцыялістычнага.

**(Працяг будзе).**

---

*) Перадрукавана з № 3-4 журнала «Большевик».

1) Маркс і Энгельс, Немецкая идеология», стар. 194. Партвыдат. 1933.

2) Маркс і Энгельс, «Немецкая идеология», стар. 196.

3) К. Маркс. «Критика Готской программы», стар. 26-27. Партвыдат. 1933.

4) Энгельс, «Анти-Дюринг», стар. 75. Партвыдат. 1933.

# НА ДАПАМОГУ ЧЭЛЮСКІНЦАМ

МАСКВА, 27. (БЕЛТА). У «Известиях» апублікавана радыёграма старшыні надзвычайнай тройкі з мыса Ванкарэм, у якой паведамляецца, што з 20-га сакавіка ў раёне лагера Шмідта, мыса Ванкарэм і Уэлена адсутнічае ўсякая бачнасць. Гэта не дазваляе самалётам рабіць палёты для перакідкі чэлюскінцаў на матэрык.

У лагеры Шмідта змяненняў няма. Настрой бадзёры.

***

ХАБАРАЎСК, 27. (БЕЛТА). 26-га сакавіка ў 4 г. 20 мін. па маскоўскаму часу Вадап'янаў вылецеў з Нагаева і ў 9 г. 45 мін. па маскоўскаму часу ўдачна спусціўся ў Гіжыга. Пілоты Галышаў і Даронін адклалі вылет на 27 сакавіка.

***

Гіжыга — маленькае паселішча, размешчанае ў 25 клм. ад вусця ракі Гіжыгі, якая ўпадае ў Охоцкае мора. Рака праходзіць сярод багністай тундры.

Вадап'янаву, праляцеўшаму ад Хабараўска да Гіжыгі звыш 2.900 клм., прадстаіць перамагчы новыя вялікія труднасці, якія вынікаюць з палёту праз мала вывучаную тэрыторыю.

ХАБАРАЎСК, 27. (БЕЛТА). Пілоты Галышоў і Даронін учора праз гадзіну пасля старта Вадап'янава з Нагаева ў Гіжыну зрабілі спробу вылёта. Аднак, даляцеўшы да Ямска, яны папалі ў густы туман і снегапад. Лётчыкі вымушаны былі вярнуцца назад. Машына Вадап'янава, якая мае большую скорасць, праскочыла туман.

Сёння Галышаў і Даронін зноў выляцелі з Нагаева. Цаводле вестак далёка-усходняга кіраўніцтва грамадзянскага-паветранага флота, яны у 6 гадзін па маскоўскаму часу прыбылі ў Гіжыгу, далучыўшыся да Вадап'янава. Заўтра — 28-га сакавіка — пілоты адпраўляюцца у далейшую дарогу — на Каменскае.

Перасовачная цырульня ў калгасе імя ДПУ (Прыгарадны сельсавет, Меншчына).

## СТАНОВІШЧА ГАБІНЕТА САІТО

ТОКІО, 26. (БЕЛТА). Сесія парламента аб'яўлена закрытай. Сесія «па тэхнічных прычынах» не зацвердзіла ўрадавага праекта змянення закона аб «небяспечных думках» і закона аб выдавецтвах. Вакол праекта змянення закона аб «небяспечных думках» разгарнулася барацьба, бо некаторыя мінсэйтаўцы настойвалі на папраўцы, якая прапануе прымяняць закон «аб небяспечных думках» і к прыхільнікам рэакцыйных і фашысцкіх арганізацый. Зменены закон прадугледжваў узмацненне кары за «спачуванне і ўдзел у комуністычнай дзейнасці» і не пашыраўся на ўдзельнікаў тэрарыстычных актаў рэакцыйных і фашысцкіх арганізацый.

Закон аб выдавецтвах прадугледжваў узмацненне цэнзуры на ўсе выдавецтвы і кантроль міністэрства сувязі над прахаджэннем выданняў.

Група сёнюкаеўцаў на апошнім пасяджэнні ніжняй палаты 25-га сакавіка ўнесла рэзалюцыю, у якой указвалася, што ўрад Саіто на працягу амаль двухгадовага існавання, «апрача задач у галіне абароны, не прадпрыняў нічога значнага, і таму ўрад павінен «распрацаваць канкрэтную палітыку». Ніжняя палата пастанавіла не галасаваць рэзалюцыю, а перадаць яе ўраду для ведама.

Падводзячы вынікі сесіі парламента, газета «Асахі» ўказвае, што наперакор чаканням сесія закончылася ўмацаваннем пазіцыі ўрада Саіто, не гледзячы на тое, што ў часе сесіі габінет страціў 3-х міністраў — Аракі, Накадзіма (міністр гандлю і прамысловасці) і Хатаяма.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ ГЕРМАНСКАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА БЮРО

БЕРЛІН, 26. (БЕЛТА).

Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, сёння прадстаўнікамі паўнамочнага прадстаўніцтва і гандлёвага прадстаўніцтва СССР — з аднаго боку і германскага ўрада — з другога падпісан заключны пратакол к эканамічным перагаворам. Пра такое змяшчае вырашэнне рада актуальных для 1934 г. пытанняў, у прыватнасці датычных адносін з рэйхсбанкам у галіне валютных мер».

## ЯПОНСКІЯ ПЛАНЫ У ШАНЬДУНЕ

ТОКІО, 26. (БЕЛТА). «Сімбун рэнго» ў паведамленні з Цындао ўказвае, што насельніцтва Цындао ахоплена «непакоем» з прычыны чутак, што «Шаньдун ператвараецца ў другое Манчжоу-Го».

У сувязі з гэтым японскі крэйсер, які павінен быў выйсці з Цындао ў Дайрэн, астаўся ў Цындао. Кітайскія ўлады арыштавалі 6 чалавек, распускаўшых «чуткі»; аднак, непакой насельніцтва не рассеяўся.

На думку прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў, напружанае становішча ў Цындао, магчыма, звязана з уварваннем войск Лю Гуйдана (у свой час Лю Гуй-дан у якасці японскага агента арудаваў у дэмілітарызаванай зоне Паўночнага Кітая) у правінцыю Шаньдун, у раён на захад ад Вандэ. Паміж войскамі Лю Гуй-дана і войскамі губернатара правінцыі Шаньдун адбыўся бой. Рух на Цянзін-Пукоўскай чыгунцы быў часова спынен.

ШАНХАЙ, 26. (БЕЛТА).

У спробах вядомага японскага агента Шы Ю-саня выклікаць бесперадзі ў Цындао бачаць чарговы ход японскага імперыялізма ў Паўночным Кітаі. У сувязі з рыхтаваўшымся выступленнем кітайскія ўлады ў Цындао аб'явілі ўчора ваеннае становішча і арыштавалі звыш 80 чалавек. Трывога за лёс Паўночнага Кітая асабліва ўзмацнілася, калі замежныя пасланнікі збіраюцца перавесці пасольствы з Бейпіна ў Нанкін. Чуткі гэтыя былі настолькі ўпартыя, што кіраўнік дыпламатычнага корпуса ў Бейпіне вымушан быў апублікаваць афіцыяльнае абвяржэнне.

## ХАОС І РАЗРУХА Ў МАНЧЖУРЫІ

ШАНХАЙ, 26. (БЕЛТА).

Кітайскі журнал «Піпле трыбюн» адзначае паўнейшую нездольнасць урада Манчжоу-Го і японцаў, што стаяць за яго спіной, справіцца з хаосам і разрухай у Манчжурыі. Розныя японскія чыноўнікі, «советнікі», інструктары, шпіёны і гандляры опіумам не ўпэўнены ў сваёй безапаснасці ў новым «раі». Многія з іх забіты, многія ўведзены «бандытамі», не гаворачы ўжо аб стратах, якія нясуць рэгулярныя войскі ў барацьбе з паўстанцамі. Узброеныя японскія эмігранты, якія адпраўляюцца ў Манчжурыю дзесяткамі і сотнямі, варочаюцца, горка расчараваўшыся ў спробах абаснавацца ў чужаземным і варожым краі.

Аб агульным становішчы ў Манчжурыі можна судзіць па заяве японскага генерала Хатторы (камандуючага 7 брыгадай), які ўказаў, што на працягу 10 месяцаў ён вёў 150 баёў з кітайскімі паўстанцамі, страціўшы забітымі і раненымі 520 афіцэраў і салдат.

2 гады, якія японцы намецілі для «перыяда ўціхамірання», ужо даўно прашлі. Дарэчы, яны ўжо павялічылі гэты перыяд на 10 год. Але і ў гэтым тэрміне, як відаць, можна вельмі сумнявацца.

## ЯПОНСКІ БАРОН ПАТРАБУЕ ЎЗБРАЕННЯ ГЕРМАНІІ

ТОКІО, 26. (БЕЛТА).

«Джапан адвертайзер» апублікавала зварот члена верхняй палаты барона Сакатані да «сур'ёзна настроеных дзяржаўных дзеячоў свету» з прапановай «аб метадах гарантыі усеагульнага міру».

Сакатані прапануе Лізе нацый абмеркаваць рад умоў. Між іншым прапануецца запрасіць ЗША ў Лігу, прызнаць Манчжоу-Го, пасля чаго Японія возьме назад сваю заяву аб выхадзе з Лігі; задаволіць патрабаванні Германіі аб узбраеннях, пасля чаго Германія таксама вернецца ў Лігу; стварыць дадатковыя органы для вырашэння пытанняў, якія могуць узнікнуць з прычыны асаблівых мясцовых умоў, напрыклад, адзін для Ўсхода, другі для Амерыкі; адмовіць у членстве Лігі ўсякай краіне, якая «настолькі ўпутрана падзелена ці дэзарганізавана, што не знаходзіцца пад кантролем сваіх цэнтральных улад (маецца на ўвазе Кітай)».

«Джапан адвертайзер» указвае, што зварот прадстаўляе інтарэс толькі таму, што «ўпершыню адказны японец высоўвае канструктыўную прапанову аб пераглядзе статута Лігі нацый. Сакатані — першы японец, які гаворыць аб магчымасці звароту Японіі ў Лігу».

У афіцыяльных колах катэгарычна адхіляюць якую-б там ні было сувязь звароту Сакатані з урадавымі коламі. У палітычных колах указваюць, што хоць Сакатані не адыгрывае актыўнай палітычнай ролі, яго зварот можа азначаць, з аднаго боку, «незграбную спробу» стварыць антысовецкі фронт, а з другога — імкнеен не даказаць гатоўнасць збліжэння Японіі з ЗША, паколькі першай умовай высоўваецца запрашэнне ЗША ў Лігу нацый.

БЕРЛІН, 26. (БЕЛТА). «Берлінер берзен цэйтунг» вітае зварот Сакатані, характарызуючы яго, як выступленне ў абарону германскага роўнапраўя ва ўзбраеннях.

### ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІ КАНФЛІКТ

## ЗАЯВА БЕКА

ВАРШАВА, 26. (БЕЛТА). Друк публікуе заяву міністра замежных спраў БЕКА прадстаўніку агенцтва «Искра». Бек рашуча абвяргае чуткі, якія пашыраюцца часткай замежнага друку аб польска-літоўскіх перагаворах і аб пасярэдніцтве графа Зубава ў Варшаве.

«Зубаў, які з'яўляецца кузенам маршала Пілсудскага, — заявіў Бек, — быў сапраўды прынят маршалам, але выключна прыватным парадкам, як сваяк. Аб палітычных перагаворах паміж Варшавай і Каўнас няма і гутаркі».

Бек наступным чынам ахарактарызаваў працяўны этап польска-літоўскіх адносін: «Становішча вайны паміж Латвіяй і Польшчай было ліквідавана ўстанаўленнем яго мінмасці ў часе прабывання маршала Пілсудскага ў Жэневе ў 1927 г. Урэгуляванне адносін паміж Польшчай і Літвой было тады перадана Лізе нацый. На гэтай аснове пад кіраўніцтвам Лігі нацый былі пачаты польска-літоўскія перагаворы. Ужо ў пачатку перагавораў урад Вальдэмараса адкрыта праявіў сваё нежаданне змяніць недарэчнае становішча рэчаў. — Нашы песімістычныя прагнозы, — заявіў далей Бек, — у далейшым аказаліся правільнымі. Ліга нацый нічога не зрабіла па гэтаму пытанню. Паследаваўшыя за ўрадам Вальдэмараса новыя літоўскія ўрады таксама не праявілі ніякіх намаганняў у гэтым напрамку».

Газеты публікуюць абвяржэнне міністра Бека на відным месцы пад загалоўкам: «Няма перагавораў паміж Польшчай і Літвой».

***

ВАРШАВА, 26. (БЕЛТА). Польскае агенцтва паведамляе: «Увесь друк прыпісвае асаблівае значэнне заяве міністра замежных спраў Бека аб польска-літоўскіх адносінах. Каментуючы заяву Бека аб польска-літоўскіх адносінах, афіцыёз «Газета польска» піша:

«Становішча польска-літоўскіх адносін можна вызначыць формулай: ні мір ні вайна». Гэтыя адносіны, якія былі наўмысна створаны Літвой, не толькі недарэчны, але і абсалютна бясспдны. Яны не далі і не могуць даць Літве нічога станоўчага. Літва заблыталася ў тупіку свайго нездавальнення, звязваючы ўсе гэтыя надзеі з ілюзіямі па поваду не менш ілюзорных міжнародных адносін. Пры ўпартасці, з якой Літва праводзіла гэтую варожую Польшчы тактыку, усякая спроба Польшчы змяніць гэта бязглуздае становішча была-б роўнасільна спробе прабіць лбом сцяну. Але ўсё гэта нас не датычыць, усё гэта — пытанне ўнутранай палітыкі Літвы. У процівагу гэтаму становішча на польска-літоўскай граніцы павінна вельмі цікавіць нас таму, што гэта граніца разам з тым — наша граніца. Тым часам становішча на граніцы можна справядліва назваць варварскім. Бо калі бацька для сустрэчы з сынам павінен хадайнічаць ад візе ў сталіцы трэцяй краіны, каб атрымаць у выключным парадку дазвол на ўезд, калі для чыгуначных, паштовых, тэлефонных і тэлеграфных зносін паміж двума суседнімі краінамі неабходна скарыстаць пасярэдніцтва трэцяй краіны, калі для паездкі з Вільні ў Коўну, або назад трэба рабіць крук праз Рыгу або Кенігсберг, калі для выпіскі польскай газеты ў Літве неабходна мець спецыяльны дазвол літоўскіх улад, калі тавараабмен паміж абодвума краінамі можа адбывацца толькі пры пасярэдніцтве трэціх краін, калі сплаў леса па рэках, працякаючых па Польшчы і Літве, стаў зусім немагчымым — калі ўсё гэта адбываецца ў цэнтры Еўропы праз 16 год пасля сусветнай вайны і праз 7 год пасля таго, як Вальдэмарас у Жэневе заявіў аб абавязковасці адносін паміж Польшчай і Літвой, — то гэта ні што іншае, як сапраўднае варварства, якое ні ў малейшай меры не апраўдваецца даўнасцю. Наадварот, вельмі многа цягнулася гэта варварства. Вельмі вялікі анахранізм становіць яно, каб цярпець яго ў Еўропе наогул і на граніцах Польшчы ў прыватнасці».

## Галадоўка совецкага грамадзяніна, зняволенага у харбінскай турме

ХАБАРАЎСК, 27. (БЕЛТА).

У сувязі з апошнім пратэстам совецкага консула ў Харбіне па поваду пагаршэння становішча арыштаваных над рознымі прадлогамі совецкіх грамадзян, паліцыя, як паведамляюць з Харбіна, 23-га сакавіка запрасіла доктара для агляду арыштаванага т. Ферэнца, аб'явіўшага галадоўку.

Тав. Ферэнц галадае ўжо 5 сутак. Ён быў арыштован яшчэ 2-га лістапада мінулага года і да гэтага часу трымаецца ў ліку іншых арыштаваных совецкіх грамадзян у паліцэйскай турме. Ніякіх абвінавачванняў ні яму, ні іншым арыштаваным прад'яўлена не было. У знак пратэста супроць многамесячнай зацяжкі яго беспрычыннага арышта тав. Ферэнц аб'явіў галадоўку.

Паліцыя настойвала, каб доктар забараніў т. Ферэнцу галадаць на стану яго здароўя, але арыштаваны спыніць галадоўку катэгарычна адмовіўся.

24-га сакавіка віцэ-консул т. Дрыбінскі наведаў намесніка дыпламатычнага агента Манчжоу-Го Сімамуру і рашуча настойваў на неадкладным вызваленні т. Ферэнца і іншых беспадстаўна арыштаваных совецкіх грамадзян, падкрэсліўшы, што манчжурскія улады поўнасцю адказны за іх жыццё і стан здароўя. Сімамура абяцаў знесціся з уладамі.

## УСКРЫЦЦЕ І ХАРАКТАР ВЕСНАВОЙ ПАВОДКІ НА БУЙНЫХ РЭКАХ БССР

На р. Дняпры ля Оршы першая перасоўка ільду адбылася 19 сакавіка, ледаход пачаўся 22-га, прахаджэнне грэбня веснавой паводкі мы мелі 24, вышынёй у 5,21 метра над умоўным нулявым узроўнем, а зараз на 26 мы маем зніжэнне ўзроўню на 0,38 метра і паступовае спыненне ледаходу.

На р. Дняпры ля Магілева ледаход пачаўся 21 сакавіка, прахаджэнне грэбня веснавой паводкі адбылося 23, вышынёй у 6,50 м. І зараз мы наглядаем паступовае зніжэнне ўзроўню, якое 26 вызначылася ў зніжэнні на 0,8 метра, ледаход паступова спыняецца.

На р. Дняпры ля Лоева першая перасоўка ільду адбылася 23 сакавіка, ледаход пачаўся 24, які прадаўжаецца і па 26 разам з паступовым уздымам узроўню, які ўжо дасягнуў вышыні 3,5 м. і ў бліжэйшы час чакаецца дадатковы ўздым на 1,4—1,8 метраў.

На р. Сожы ля Прапойска ледаход пачаўся 23 сакавіка, і ў той-жа дзень наглядалася прахаджэнне грэбня веснавой паводкі вышынёй у 3,74 метра, а зараз, на 26, узровень зніжэўся на 0,2 м. і рака ачысцілася ад ільду.

На р. Сожы ля Гомеля перасоўка ільду адбылася 23 сакавіка, ледаход разам з падёмам узроўню пачаўся 24 і працягваецца па 26, прычым узровень дасягнуў вышыні 4,9 м. і ў бліжэйшы час чакаецца дадатковы ўздым на 0,1—0,2 м.

Рака Бярэзіна ля Барысава ўскрылася 20 сакавіка, ледаход пачаўся 24; 25 адбылося прахаджэнне грэбня вышынёй у 3,96 м. і рака ачысцілася ад ільду.

Рака Бярэзіна ля Бабруйска ўскрылася 22 сакавіка, ледаход пачаўся 24 і прахаджэнне грэбня паводкі адбылося 25, вышынёй у 3,57 м., а зараз, на 26, мы маем паступовае зніжэнне ўзроўню на 0,1 метра.

На р. Прыпяці ля Мазыра перасоўка ільду адбылася 18 сакавіка, ледаход пачаўся 20 і к 23-му рака ачысцілася ад ільду. Зараз-жа, на 26, прадаўжаецца ўздым узроўню, які ўжо дасягнуў вышыні ў 4,25 м. і ў бліжэйшы час чакаецца дадатковы ўздым на 0,5—0,7 метраў.

На р. Зах. Дзвіна ля Віцебска ледаход пачаўся 23 сакавіка, прахаджэнне грэбня паводкі адбылося 25, які дасягнуў вышыні 6,36 м., а зараз пачаўся спад і прадаўжаецца ледаход.

Наогул веснавая паводка на буйных рэках БССР у бягучым годзе вельмі нязначна перавышае размеры нармальнага поўнаводдзя.

Нач. ГК АГМС БССР МАМАЕЎ.
Інж. гідралог СВАДКОЎСКІ.

## ДНЕПР—СВІСЛАЧ

Удзельнік дэлегацыі БССР на нарадзе ў Ленінградзе тав. Крукоўскі паведаміў супрацоўніку «Звязды» некаторыя даныя аб праблеме Вялікага Дняпра.

У праект першай чаргі ўключан рад работ па Беларусі. Намячаецца пабудова канала праз перавал Заходняй Дзвіны і прапускоў па рацэ Ловаці Віцебскага напрамку.

У Оршы будзе пабудована гідрастанцыя магутнасцю ў 20 тыс. клв. першай чаргі.

Асаблівы інтарэс прадстаўляе варыянт злучэння Свіслачы з Дняпром водным шляхам праз Бярэзіну. Гэта дасць магчымасць ператварыць Свіслач у суднаходную раку і пазбавіць Менск ад паводак.

Паводле думкі выдатнага інжынера праф. Магілко злучэнне Свіслачы з Дняпром у тэхнічных адносінах зусім ажыццявімо.

Праектуецца стварэнне водахавальніка, шлюзаванне Свіслачы, расчыстка ракі і т. д.

## РАДЫЁ-ВУЗЕЛ У КАЛГАСЕ

Па калгасах Баравікоўскага сельсовета, Рэчыцкага раёна, роўнымі металічнымі шнурамі цягнуцца лініі нядаўна арганізаванага радыёвузла. Амаль ва ўсіх хатах калгаснікаў устаноўлены радыёкропкі.

Радыёвузел абсталяваны ў калгасе «Чырвонае жыццё».

## 2.000 БІБЛІЯТЭК ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Соўнарком БССР адпусціў 150 тыс. руб. на бібліятэкі для настаўнікаў-ударнікаў. Наркамасветы камандыраваў у Маскву спецыяльнага работніка для набыцця каля 2.000 бібліятэк з педагагічнай і палітычнай літаратурай. Кожны настаўнік-ударнік атрымае бясплатна бібліятэку для ўзняцця сваёй кваліфікацыі.

## ТЫРАЖ АЎТАЛАТАРЭІ

У клубе імя Сталіна адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае тыражу 5-га разрада 4-й усесаюзнай латарэі Аўтадора. Пасяджэнне адкрыў начальнік Галоўдартранса БССР тав. Іваноў.

На вечары заключан соцдагавор паміж Заходняй вобласцю і БССР на хутчэйшую рэалізацыю білетаў 5-й усесаюзнай аўталатарэі і выкананне абавязацельстваў па соцспаборніцтву з Чувашыяй.

Пасля ўрачыстай часткі пачаўся тыраж. На вяэорнім пасяджэнні разыграна 1.800 білетаў.

У гонар тыража аўталатарэі Аўтадорам быў арганізован аўтапрабег па гораду.

## РЭКАНСТРУКЦЫЯ ДНЯПРА І ВОЛГІ

### Даклад інжынера Ваевудскага

Навуковы камітэт па праблеме Вялікага Дняпра пры Беларускай Акадэміі Навук заўтра, 28 сакавіка, у 7 гадзін вечара ў канферэнц-зале Акадэміі Навук (рог. Універсітэцкай і Ленінскай) ставіць даклад інжынера Ваевудскага на тэму «Схемы тэхнічнай рэканструкцыі Дняпра і Волгі».

Уваход вольны.

## ФІЗКУЛЬТУРА

Закончыўся злёт лепшых гімнастаў Менска, у якім прымала ўдзел 50 чалавек. Першае месца сярод мужчын заняў тав. КУЖАЛЁЎ (Н-скі полк) і другое месца тав. ГАВЕЙКА (Н-ская дывізія).

З жанчын першае месца заняла тав. ШВЕДАВА і другое месца тав. ЛЕБЕДЗЕВА (працасветы).

30 сакавіка ў Смаленск выязджае зборная каманда барцоў і баксёраў Менска для сустрэчы са зборнымі камандамі Смаленска. У складзе менскай каманды лепшыя барцы — пераможцы ўсебеларускіх спаборніцтваў 1933 г. — т.т. ІОСЕЛЕВІЧ І., ІОСЕЛЕВІЧ Г., АНЦІМАЙЗЕЛЬС, КРУПНІК, МІРСКІ; ПАЎ, РУБІН, баксёры БЫЧКОЎСКІ, ПАЧАСЮК і КАВАЛЬЧУК. Большасць удзельнікаў — рабочыя будаўнікі. Сустрэча ставіць сваёй мэтай праверку гатоўнасці барцоў і баксёраў Менска да прадстаячага ўсебеларускага свята па цяжкай атлетыцы.

Адбыліся міжгародныя сустрэчы па валейболу каманд Менска і Смаленска. Першымі сустрэліся жаночыя каманды Смаленска (зборная) і Менска (працасветы) з вынікам 2:0 у карысць каманды Менска. Сустрэча мужчынскіх каманд Смаленска (зборная) і Менска («Дынамо») таксама закончылася з вынікам 2:0 у карысць Менска. З такім-жа вынікам прайшлі сустрэчы зборных мужчынскіх і жаночых каманд Менска і Смаленска (БЕЛТА).

## ВЕСНАВЫЯ БАЗАРЫ

Калгасныя веснавыя базары абудуцца ў Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве і Бабруйску 8 і 9 красавіка.

Белкаапсаюз прапанаваў гандлёвым кіраўніцтву выдзеліць прамтавары лепшага асартымента на 50 тыс. руб. — гатовае адзенне, трыкатаж, галантарэю, гаспадарчыя і культтавары і т. д.

На базарах будзе наладжана культурнае абслугоўванне калгаснікаў. Арганізуюцца выступленні артыстаў Белдамэда. Рынкі радыёфікуюцца.

## НОВЫЯ МЕДЫЧНЫЯ ПУНКТЫ

Усе буйныя лячэбныя ўстановы Менску прымацаваны да пэўных сельсоветаў раёна для абслугоўвання іх на час пасеўнай кампаніі.

Дом санасветы рыхтуе для 1 і 2 МТС дзве санітарныя перасоўкі выстаўкі.

Да 1 красавіка ў сельсоветах Менскага раёна адкрываецца 19 новых медычных пунктаў. Аптэкакіраўніцтва накіроўвае ў сельсоветы 6 перавачных аптэк.

Лепшыя лячэбныя ўстановы і медработнікі будуць занесены на чырвоную дошку. Для прэміравання старан прэміяльны фонд у 2 тыс.

## СПІС

**дакладчыкаў, вылучаных Менгорсоветам па правядзенню антывелікоднай кампаніі 1934 г.**

**Вальфсон** (БелАН) — завод імя Варашылава, **Вапабрынскі** (медінстытут) — завод «Большэвік», **Фрыдрых** (БелАН) — фабрыка «Ўсход», **Лапатка** (БелАН) — завод «Чырвоны золак», **Кірушын** (БелАН) — фабрыка імя Крупскай, **Грынблат** (БелАН) — фабрыка «Комунарка», **Пшаічны** (БелАН) — спіртазавод, **Шэйман** (БелАН) — завод ланцугоў Галля, **Станкевіч** (БелАН) — завод «Комунар», **Поляк** (БелАН) — фабрыка імя Фрунзе, **Выдра** (ВКСГПІ) — завод імя Молатава, **Бер** (газ. «Окцябр») — фабрыка імя 8 сакавіка, **Зарэмскі** (БелАН) — Эльвод, **Краўчук** (БелАН) — завод «Ударнік», **Розенгауз** (Комунбанк) — фабрыка «Окцябр», **Кубліцкі** (БелАН) — хімфармзавод, **Брахнічоў** (БелАН) — шклозавод, **Марозаў** (БелАН) — завод «Беларусь», **Агурскі** (БелАН) — фабрыка імя Кагановіча, **Кернамыцкі** (БелАН) — шчотачная фабрыка, **Карабан** (БелАН) — абутковая майстэрня горсовета, **Леўчук** (БелАН) — фабрыка «Чырв. тэкстыльшчык», **Жукоўскі** (БелАН) — скарняжная фабрыка, **Абрамчук** (БелАН) — завод «Чырв. хімік», **Дамесек** (рэд. «Окцябр») — шчаціннная фабрыка, **Рак** (БелАН) — лямцавая фабрыка, **Гомшток** (БелАН) — шпалерная фабрыка, **Ілюшэнка** (БелАН) — мясакамбінат, **Кабаноў** (рэд. «Окцябр») — хлебакамбінат, **Якубовіч** (БелАН) — фабрыка імя Тэльмана, **Марцынкевіч** (БелАН) — завод імя Мяснікова, **Пазрэзін** (БелАН) — малы рамонт ванаў, **Курлянд** (БелАН) — арц. імя Крупскай, **Рубін** (БелАН) — арц. «Новы шлях», **Сербаў** (БелАН) — арц. абутнікаў, **Горбах** (БелАН) — арц. металістаў, **Гурыновіч** (БелАН) — арц. «Прадлюстра».

Наступныя варыянты будуць накіраваны на працёўках горсовета бязбожнікаў.

**РЭЗЕРВ ДЛЯ КЛУБАЎ:**

Шукевіч-Трэцкоў (БелАН), Скардзіс (БелАН), Ксенджук (політэхнікум), Мацяйціс (БелАН), Успенскі (фізмат), Чупец (НКАсветы), Нікольскі, Прусеня, Галубёў, Каніч, Спокер, Аркан, Мешкевіч, Стоўкін, Поярковіч, Сакалоў (БелАН).

Для атрымання пуцёвак прадпрыемства, жакта, клуб, з'явіцца ў горсовет бязбожнікаў, клуб будаўнікоў, пакой № 1) ад 5 да 6 гадзін па два-тры дні ранейшага часу даклада.

Менгорсовет бязбожнікаў.

## Паведамленне

У ваенным аддзеле ЦК ЛКСМБ атрымана развёрстка на аддзяленне пілотаў у Тамбоўскую авіяшколу грамадзянскага паветранага флота. Прымаюцца асобы абодвага полу ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў з асветай за сямігодку.

Тэрмін навучання — два гады і 3 месяцы.

Школа забяспечвае бясплатна харчаваннем (чырвонаармейскі паёк), з пачатку палётаў — дметпайком, комунальнымі паслугамі, бялізнай, пасцельнымі прыладамі; абмундзіраваннем і абуткам за лік стыпендыі: стыпендыяй ад 25 руб. да 120 руб. у залежнасці ад паспяховасці.

Жадаючыя паступіць у школу па вінны падаць заяву ў ваенны аддзел райкома ЛКСМБ з дакументамі: а) аб асвеце (арыгінал), б) аб работы, в) сацыяльным становішчы і паходжанні як паступаючага, так і бацькоў, г) нараджэнні, адносінах да вайсковай службы, е) характарыстыку ад партыйна-комсамольскіх і проф. арганізацый, ж) фатаграфічныя карткі, заверанае дзяржустановай.

Праезд у абодва бакі аплачваецца школам па прад'яўленню камандыровачнага пасведчання, выданага РК ЛКСМБ.

Ваенны аддзел ЦК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
ад 28 сакавіка
Ігор ІЛЫНСКІ і А. СУДАКЕВІЧ
У лепшай вясёлай камедыі вытворчасці Межрабпомфільм
КАРОЛЬ ЭКРАНА
У праграме кіно-хроніка «САЮЗКІНО».

Гукавы кіно-тэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
Гукавы мастацкі фільм БЕЛАЯ СМЕРЦЬ
У фае—гастролі ДЖАЗ БАНДА.

ДЗІЦЯЧЫЯ ГУКАВЫЯ кіно-тэатр
Дзіцячыя сеансы
Пачатак з 3-х г. дня
Мастацкі фільм „ПЕРАМОЖЦЫ"

ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ
гукавы мастацкі фільм
ПРЫГОЖАЕ ЖЫЦЦЁ
Пачатак у 8 гадз. 30 мін.
Звыш праграмы ў дзенных і вячэрніх сэансах гастролі сусветнага атракцыёна
«ЦУДЫ ЦЕНЯЎ».

Кіно „Пролетарый".
МАСТАЦКАЯ ДРАМА па раману Дюшэна „Тэрэза"
ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ

Кіно „СПАРТАК".
ПАТ І ПАТАШОН у замежнай камедыі
ЗАГАДКА МЛЫНА № 6 ст.

КІРАЎНІЦТВА ДОМА УРАДА
прадае сталы
дзяржаўным і грамадскім арганізацыям.
Спраўляцца: кіраўніцтва Дома Урада, левае крыло, цокальны паверх, з 10 да 12 г. дня—да т. ШУКЕС.

Выдавецтва ЦК КП(б)Б «ПАРТВЫДАТ»
ПЕРАЕХАЎ
з вул. Карла Маркса
У ДОМ ДРУКУ
(Камароўка), III паверх.

МЕНГОРСОВЕТУ ПАТРЭБНЫ
на пастаянную работу кваліфікаваныя
ЭКАНАМІСТЫ.
З прапановамі звяртацца ў горсовет (вул. К. Маркса, 16, пакой 35).

Школа ФЗВ пры Магілёўскай шоўкавай фабрыцы
абвяшчае НАБОР вучняў
па спецыяльнасці прадзільшчыкаў і матальшчыц.
У школу прымаюцца дзеці рабочых, калгаснікаў, беднякоў, сераднякоў і служачых. Узрост не менш 17 год і не больш 19 год. Адукацыя не менш 6-7 груп сямігодкі. Вучні забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам, сталовай і прадуктовымі карткамі па 1 спісу 1-й кат.
Тэрмін навучання 6 месяцаў.
Заявы прымаюцца да 1 красавіка 1934 г. Да заяў патрэбна прыкласці дакументы: аб нараджэнні, аб адукацыі, соцстановішчы бацькоў, заверaную анкету, на адказ паштовых мрак на 40 к. Без дакументаў заявы не разглядаюцца.
Адрас: г. Магілёў, быхаўскае шасе, барак 4, школа ФЗВ.
Загадчык ФЗВ АРЭНЗОН

## АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА
### ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

27 сакавіка 1934 г. г. Менск.

## ПРА ВУЛІЧНЫ РУХ у г. МЕНСКУ

1. Працягнуць правілы вулічнага руху ў г. Менску 1933 г. на 1934 год.
2. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на РС міліцыю.

Старшыня Менгарсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менгарсовета КАПЕЛЕВІЧ.

З 31-га сакавіка на 1-е красавіка ў 0 гадзін 30 хв.
НКА, ДВБ, КОГІЗ і БАКТ
арганізоўваюць
## УСЕБЕЛАРУСКУЮ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКУ
па праверцы ходу збору сродкаў на выпуп стабельных падручнікаў на 1934-35 навучальны год і падрыхтаванасць прышкольных участкаў да сяўбы і па пытанню разгортвання дашкольных устаноў. Перакліччай кіруюць наркомасветы, тав. ЧАРНУШЭВІЧ, ЦП саюза працасветы, заг. ДВБ тав. БРАЎКОВІЧ, нач. школьнага кіраўніцтва т. ЛЯШЧЫНСКІ, заг. БАКТ'а тав. ЛЮБІЧ, заг. бел. аддзялення КОГІЗ'а т. ВЕРАШ. На перакліччу выклікаюцца ўсе заг. АНК, заг. узорных школ, заг. райаддзелаў ДВБ, БАКТ'а, прадстаўнікі райсвяўаў і заг. адз. КОГІЗ'а.
Выклікаюцца наступныя раёны:
1. Дзяржынскі, 2. Віцебскі, 3. Магілёўскі, 4. Ушацкі, 5. Семіонскі, 6. Брагінскі, 7. Чэрыкаўскі.
Астатнія раёны падрыхтаваюцца да дакладаў, бо ў часе перакліччі будзе дадаткова дана слова іншым раёнам.

1-га красавіка ў 21 гадзіну 40 мінут
слухайце па радыё ДАКЛАД-ЛЕКЦЫЮ
на тэму:
„ЗАДАЧЫ КАС ГРАМАДСКАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ КАЛГАСАЎ У ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ".
Усім інспектарам раён. (гар.) сабезаў, КСТУ і касам грамадскай узаемадапамогі калгасаў арганізаваць масавае слуханне.
НАРКАМСАБЕЗ
ЦКСТУ

Менск, друкарня «Звязды».
Упоўн. Галоўлітбела № К—2537.